Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 29 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 141 (4585) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

26—28 чэрвеня адбыўся пленум Менгаркому КП(б)Б з удзелам сакратароў сельпарт'ячэек, старшынь сельсаветаў, нач. палітаддзелаў і вясковага партактыву.

На пленуме ГК абгавораны наступныя пытаньні:

1. Канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні ўборачнай і загатоўчай кампаніі (дакл. т. КУДЗЕЛЬКА);

2. Аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) «Аб рабоце палітаддзелаў, калгаснай ячэйцы і аб узаемаадносінах паміж РК і П А» (дакл. т. ГЕРШОН);

3. Аб ходзе будаўніцтва па горадзе і раёне (дакл. т. КАВАЛЁЎ);

4. Інфармацыя аб ходзе чысткі менскай партарганізацыі (старшыня гарадзкой камісіі па чысткцы т. РЫСКІН);

5. Аргпытаньні.

З вялікай прамовай выступіў сустрэчаны бурнымі аплёдысмэнтамі сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫЯ—У ПЕРШЫЯ РАДЫ АРГАНІЗАТАРАЎ ПАСЬЛЯХОВАЙ УБОРКІ І ЗАГАТОВАК!

Вопыт работы спажыўкаапэрацыі па абслугоўваньні пасеўнай кампаніі сёлетняга году за першыя правядзеньня Усебеларускага конкурсу на лепшае абслугоўваньне ... дабіўся посьпехаў ... і рэнтабельнасьці ... у рабоце? Адказ ясны: ... строгага ўліку значэньня кожнага ... вучастку, саўгасу, калгасу, брыгады паселішча, на аснове добраякаснага выкананьня заключаных дагавораў паміж каапэрацыяй, калгасамі і брыгадамі і аднаасобнікамі, па асноўнага разуменьня задач веснавой кампаніі і строгага ўсебаковага ... поспеху на вёсцы быў перадаваны гандаль. Шляхам разовак, раз'ясьнальных гутарак, масавай работы (друк, чорныя і ... дошкі, дошкі ўдарнікаў) спажыўкааперацыя там здолела ... ... Ведаць, што ў яго не хапае ... іменна тавары і прадметы зараз ... ... і каму ў першую чаргу ... іх прадаць з тым, каб ня ... ... і бракароб, а сапраўдны ... пасьля сапраўднай праверкі ... ім якасных і калгасных ... ... і ў ... і ... і ... і

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Выкрыць двурушніцкі твар нацыяналістычных элемэнтаў, рашуча ачысьціць ад іх партыю—важнейшая задача чысткі

Нутро засталося бундаўскім

Старшыня рэспубліканскай камісіі па чысткі тав. АНЦІПАЎ у сваім дакладзе на ўсебеларускім сходзе парактыву, адзначаючы асаблівасьці чысткі ў беларускай партарганізацыі, падкрэсьліў, як адну з важнейшых асаблівасьцяй, значную колькасьць выхадцаў з дробна-буржуазных партый, у першую чаргу, выхадцаў з Бунду. Тав. Анціпаў закастрыў увагу на гэтым партарганізацыі, паказаўшы, як сур'ёзна адносіўся тав. Ленін да выхадцаў з іншых партый.

«Уся барацьба нашай партыі,—сказаў тав. Анціпаў,—ёсьць барацьба супроць меншавізму, супроць дробна-буржуазных партый наогул, якія за ўвесь час рэвалюцыі ва ўсім сваёе паказалі, што гэтыя партыі выражаюцца самай надзейнай апорай капіталістычнага грамадзтва, вернымі служкамі гэтага капіталістычнага грамадзтва. І ў нас ёсьць рэльны ня меншыя колькасьць людзей з гэтых партый, якія сапраўды сумлен ва перайшлі на наш бок».

Прабліскасьць гэтай ацэнкі непш за ўсё пацьвярджаецца на фактах чысткі. Вось характэрны факт з практыкі чысткі ў ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІНА (Менск).

Перад камісіяй—САПОЖНІКАЎ, член партыі з 1918 г. Ён са сваёй аўтабіяграфіі выпускае ўсяго толькі адну «дробязь»—17-гадовае прабываньне ў партыі Бунду. Старшыні праверкому тав. СТАРАВОЙТАВУ прышлося аб гэтым яму нагадаць.

Калі-б Сапожнікаў сапраўды парваў з Бундам, ён-бы тут-жа расказаў камісіі, усяму сходу, як гэта дробна-буржуазная партыя ашукала рабочыя масы, якую яно служыла, паказаў-бы яе контр-рэвалюцыйную сутнасьць і расказаў-бы, як ён, уступіўшы ў бальшавіцкую партыю, перамог бундаўскія тра дыцыі, выкрываў перад масамі рабочых контр-рэвалюцыйную ідэалёгію Бунду, змагаўся з яго ідэалізацыяй. Перад Сапожнікавым стаяла задача—паказаць, як ён практычнымі справамі даказаў, што ён сур'ёзна парваў з усімі пражыткамі гэтай адрэднічай дробна-буржуазнай партыі, як ён змагаўся ў радах бальшавіцкай партыі за генэральную лінію. Але Сапожнікаў застаўся верным сабе, сабе—ке камуністу, а БУНДАЎЦУ.

— Я быў у Бундзе з 1901 па 1918 г. —тонам высокай вартасьці заявіў ён.

Больш аб гэтым Сапожнікаў ня хоча гаварыць:

— Навошта аб гэтым успамінаць цяпер?—нібуда пытаецца ён.

І сапраўды яму нявыгодна варочацца да гэтага пытаньня, нявыгодна трымаць адказ перад партыяй, перад рабочай клясай, як ён ажыў бундаўскую ідэалёгію.

Ні аднаго сходу, ні аднаго выпадку з моманту ўступленьня ў партыю бальшавікоў (1918 г.) ня можа Сапожнікаў «прыпомніць», калі ён выступаў з выкрыцьцём дробна-буржуазнай сутнасьці Бунду. Сапожнікаў на можа прыесьці ні аднаго выпадку сваёй практычнай барацьбы з ухіленьнямі ад генэральнай лініі бальшавіцкай партыі, сваёй непрымірымасьці да ўхілістаў, сваёй рашучасьці ў барацьбе з дробна-буржуазнымі партыямі, ні аднаго выпадку сапраўднай абароны бальшавізму. Наадварот, на сходзе высьвятляецца другое. Будучы ўжо ў радах партыі бальшавікоў сакратаром партыйнай ячэйкі, калі правярэлася макапітчасьць радоў бальшавіцкай партыі ў барацьбе з трацкісцкай контррэвалюцыйнай апазыцыяй, Сапожнікаў устрымаўся пры галасаваньні пытаньня аб выключэньні Троцкага з партыі. Ён, бачыць, не пасьпеў разабрацца, хто мае рацыю і хто ўінават—партыя, ці Троцкі, і таму парашыў устрымацца.

Сапожнікаў наогул прыцідваецца прастачкам, малапісьменным, нічога неразумеючым у палітычных пытаньнях.

— Я яшчэ ў 1905 годзе адмоўна адносіўся да Бунду—прабуе апраўдацца Сапожнікаў.

Аднак, «адмоўныя адносіны» не перашкодзілі Сапожнікаву заставацца ў Бундзе пасьля гэтага яшчэ 13 год (да 1918 году). Сапожнікаў дарэмна прабуе представіць сябе нявінным ягнём «бундаўскага стада».

— Я быў усяго толькі радавым членам Бунду і не магу адказваць за підзраў—з. ў апраўдваецца Сапожнікаў. Па яго думцы радавы член Бунду—гэта нявінная безадказная асоба.

Камісіі ўдаецца да гэтага ўстанавіць, што Сапожнікаў далёка не радавы член Бунду. Сам ён прызнаўся:

— Я арганізоўваў падпольныя друкарні, ён даваў падпольную літаратуру і быў старшынёй легальнага яўрэйскага саюзу друкароў.

Нічога сабе «радавы»! 17 год Сапожнікаў ашукваў яўрэйскія рабочыя масы, затуманьваў іх галовы нацыяналістычнымі ідэямі, адцягваючы ад рэвалюцыйнай барацьбы, разьбіваючы адзіны фронт усяго пралетарыяту, вёў згодніцкую палітыку з буржуазіяй. І гэта, па яго думцы, «нявінная роля радавога».

Характэрна, што ў гэтага «радавога», «палітычна малапісьменнага» не — не дый прарываюцца захаваньня ў глыбі душы бундаўскія погляды і настроі.

— Хто мог прадбачыць, што будзе Кастрычніцкая рэвалюцыя і Бунд назавуць адрэднічай арганізацыяй?—«апраўдваецца» Сапожнікаў.

Выходзіць, паводле Сапожнікава, што ўсё-ж Бунд ня здрадніцкая арганізацыя, што калі-б не Кастрычніцкая рэвалюцыя, ён застаўся-б у партыі Бунду, выйсьці яго адтуль прымусіла не перакананьне ў здрадніцкай ролі яго. Недарма ён і зараз лічыць яе рэвалюцыйнай арганізацыяй. Фактам 17-гадовай прыналежнасьці да Бунду ён у пачатку чысткі хацеў пахваліцца, як р-р-рэвалюцыйнай заслугай. І іменна тэй акалічнасьцю, што на гэтых пазыцыях ён застаецца і па гэты дзень, можна тлумачыць тое, што ён на ўсім працягу прабываньня ў партыі бальшавікоў ні разу ня выступіў з выкрыцьцём буржуазнай ідэалёгіі Бунду.

Тонам мешчаніна, які на ўсё глядзіць, як пабочны глядач, а не як актыўны ўдзельнік, ён заяўляе:

— Каму трэба, няхай ідэалізуе Бунд...

Яго, бачыце, гэта не датычыць, няхай хто хоча ідэалізуе, ён пастаіць і паспухае.

Як-жа Сапожнікаў на вытэорчасьці? Аб гэтым сказалі рабочыя ДАНКМАН, МІЛЬХМАН, ЗАГОРСКІ, ШЛЯМБЭРГ і інш.

—Горшым рабочым быў да вылучэньня на адказную работу,такім ён застаўся і зараз. Калі працаваў у ЦП саюзу, абараняў рвачоў, п'яніц, прагульшчыкаў. Будучы выпуканым дырэктарам друкарні камвузу, незаконна выпісаў сабе там 1.700 руб. розьніцы зарплаты, а за гэта... разваліў работу, насадзіў п'янства, распусту. Зараз ён зьнят адтуль з работы. Працуе зноў на вытворчасьці і зноў робіць брак; хоць лічыцца старшынёй цэхкому, але нічога ня робіць. Сапожнікаў мае некалькі спагнаньняў, у тым ліку суровую вымову. Па водгуках рабочых ён ніколі і нідзе сябе ў рабоце не праявіў.

Вось сапраўды твар Сапожнікава. Ён быў і застаўся бундаўцам, нічога апульнага з бальшавіцкай партыяй ня мае. Аб гэтым сказаў ён сам у часе перапынку сходу па чысткі.

У запале гневу на свайго крытыка тав. Шлямбэрга Сапожнікаў выказаў тое, што ён мысліў увесь час, паказаў сапраўднае сваё нутро.

Ты думаеш, мне боязна пазбавіцца партбілета? Я зараз-жа магу яго аддаць...

Такі Сапожнікаў на справе. Ашукваць партыю на працягу такога доўгага часу яму ўдалося таму, што ў партколектыве друкарні імя Сталіна, як відаць, ня была ў патрэбнай ступені завострана бальшавіцкая пільнасьць.

Пры дапамозе рабочых, якія ў часе самой чысткі і тут-жа пасьля перапынку выкрылі Сапожнікава, агаліўся сапраўдны твар заядлага бундаўца.

Старшыня праверкому тав. Старавойтаў завастрыў увагу партыйнага калектыву, усіх рабочых на яшчэ большым павышэньні пільнасьці да выхадцаў з дробна-буржуазных партый, якія, прымазаўшыся да партыі бальшавікоў, прыкрываючыся партыйным білетам, робяць антыпартыйныя справы, двурушнічаюць, ашукваюць партыю, застаючыся на старых антыбальшавіцкіх пазыцыях.

Р. ДОДЗІН.

Рашучы адпор спробам заціснуць самакрытыку

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Да чысткі сваіх радоў партыйны калектыў швэйнай фабрыкі імя **Валадарскага** падышоў з вялікім прарывам у выкананьні прамфінпляну. Фабрыка з году ў год недадае дзяржаве па сотні тысяч рублёў гатовага адзеньня.

Першы квартал гэтага году для фабрыкі быў пераломным кварталам. Партыйны калектыў, мабілізаваўшы ўсе сілы, дабіўся выкананьня прамфінпляну на 108 проц. Здавалася-б, што партыйная арганізацыя, рыхтуючыся да чысткі, пазбавіла была замацаваць гэтыя посьпехі з тым, каб дабіцца далейшага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Вынікі работы фабрыкі за 2 з паловай месяцы другога кварталу гаворыць зусім аб іншым. **Плян за гэты час выкананы на 94 проц.**

Дрэнна таксама стаіць справа з якасьцю прадукцыі. Процант браку даходзіць да 2-3х. Ёсьць нават асобныя агрэгаты, якія даюць да 4-5 проц. браку.

Асобныя камуністы агрэгатаў замест барацьбы з бракам самі зьяўляюцца бракаробамі, іх брыгады і агрэгаты даюць больш браку за іншыя. Агрэгат **Багарада** пры агульным процанце браку на фабрыцы 1,9 проц. дае 3,3 проц., агрэгат **Аронава** — 2,2 проц.

Чыстка партыйных радоў павінна была ўскрыць усе гэтыя недахопы з тым, каб мабілізаваць партыйную арганізацыю і рабочы калектыў на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

5 дзён праходзіць чыстка на фабрыцы. За гэтыя дні праз камісію прашлі ўжо каля 80 членаў і кандыдатаў партыі. Аднак, усе гэтыя дні актыўнасьць па чысткі вельмі слабая. Партыйная арганізацыя ўсім слаба ўцягнула ў работу па чысткі беспартыйных рабочых. Перашкаджае разгортваньню самакрытыкі тое, што асобныя кіраўнікі фабрыкі, ў прыватнасьці дырэктар тав. **Спасаў**, сваімі паводзінамі на чысткі проста заціскаюць самакрытыку.

Аб тым, што гэта так, сьведчыць наступны факт: у першы дзень чысткі пасьля справаздачы сакратара парткалектыву выступілі асобныя члены партыі, указваючы на адсутнасьць масавай работы ў цэхах. Камуністы **Бабот і Піндрык** у сваіх выступленьнях указвалі на дрэнную работу культпрона **Сабалеўскай**. Не пасьпелі гэтыя таварыны выказацца, як бяро слова дырэктар фабрыкі Спасаў і абвінавачвае Бабота і Піндрыка ў двурушніцтве і розных ухілах.

Справа ў тым, што гэтыя камуністы, калі Сабалеўская праходзіла чыстку, як намочаныя ў члены праверкому, аб яе дрэнай рабоце нічога не гаварылі. Гэта бязумоўна не папартыйнаму. Аднак, гэта не гаворыць аб тым, што ім трэба было маўчаць да канца, а Спасаву не дае права абвінавачваць іх у двурушніцтве.

Другі факт. На другі дзень першым прадзіў чыстку загатчык бюро рацыяналізацыі тав. Кантар. На фабрыцы са 100 рабочых прапанову прынята толькі 12. Месячнік рацыяналізацыі фактычна правальваецца. У сувязі з гэтым член райправеркому тав. **Офэнгейм** зусім правільна задаў пытаньне Кантару: — «Чым растлумачыць агідную работу фабрыкі?» — Не спадобалася такое пытаньне тав. Спасаву, які адразу з месца пачынае крычаць: «Як гэта вы называеце нашу работу агіднай?» Па яго прыкладу пачынаюцца яшчэ выкрыкі з месц. Гэта сварыла ўмовы, якія чужымі партыі людзьмі выкарыстаны для агітацыі супроць самакрытыкі, супроць удзелу ў чысткі наогул, для заплохваньня і г. д.

Сама ячэйковая камісія не дала адразу адпору выступленьню Спасава, яна не разрадзіла атмасфэру заціску самакрытыкі, не растлумачыла работы, як трэба разгортваць бальшавіцкую самакрытыку.

Далейшы ход чысткі характарызуецца рэзкім зьніжэньнем зацікаўленасьці. Рэдка хто выступаў, а калі і выступаў, дык толькі «за». Адсюль і ясна, чаму на заўтра сход па чысткі сарваўся. З тысячы беспартыйных рабочых зьявіліся толькі 4 і 120 членаў і кандыдатаў партыі. Сход не адбыўся. Наступныя дні таксама не даюць таго эфэкту, які чыстка павінна даць.

Праходзіў чыстку намесьнік дырэктара і загатчык вытворчасьці **Партноў.**

Партноў самы стары працаўнік на фабрыцы. Ён працуе на кіруючай рабоце на фабрыцы з першага дня яе арганізацыі. Пад яго «кіраўніцтвам» фабрыка з году ў год ня выконвае прамфінпляну, выпускае дрэнную якасьць прадукцыі.

Патрэбна было чакаць, што Партноў дасьць самакрытычны аналіз адставаньня фабрыкі, пакажа на свае памылкі як загатчыка вытворчасьці. Аднак, гэта было толькі пажаданьне.

Партноў гаварыў аб усім. Горача выпукляе свае асабістыя заслугі. Забыў ён толькі сказаць адно, што ён доўгі час знаходзіўся ў Бундзе. Аб гэтым сваім мінулым Партноў лічыць патрэбным умаўчаць.

Толькі тады, калі яму задаецца пытаньне:

«Тав. Партноў, скажы, ці быў ты ў Бундзе?» Атрымліваецца адказ: «Фармальна я ня быў, а дапамагаць—дапамагаў. Ведаеце ў нашым мястэчку другіх рэвалюцыйных (? Н. Н.) арганізацый ня было, па-другое, уся работа нашага Бунду і наогул Бунду вынулялася ў арганізацыі вечарынак, другой работай ніякай не займаліся».

Былы бундавец Партноў з трыбуны камісіі на чысткі прабуе паказаць Бунд, як адзіную рэвалюцыйную партыю яўрэйскага пралетарыяту. Ён ня толькі не паказвае на контр-рэвалюцыйную ролю Бунду, а нават і зараз прабуе ідэалізаваць яе.

Партноў не раскрыў здрадніцкую сутнасьць «вечарынак», якія праводзіліся для таго, каб дабіцца згодніцтва паміж капіталістамі і рабочымі.

Пачынаюцца спрэчкі. Здавалася-б, што партыйны павінны былі-б выкрыць сапраўдны твар былога бундаўца, які зараз сваім «кіраўніцтвам» давёў фабрыку да такога становішча. Аднак, гэтага ня было. **За** Партнова выступаюць многія, выступае і дырэктар фабрыкі тав. Спасаў. Па яго, ня важна, што Партноў жадаў захаваць сваё прабываньне ў Бундзе і ідэалізуе яго. Выступае яшчэ рад камуністаў, але-ж ні адзін не сказаў і не раскрыў сапраўднага твару бундаўцкай арганізацыі, яе контр-рэвалюцыйную ролю. Не раскрыла сутнасьць бунда і ячэйковая камісія па чысткі.

Калі праходзіў чыстку старшыня фабкому тав. **Каганэр,** не знайшлося ні аднаго камуніста, які-б сказаў хоць слова аб дрэнай рабоце фабкому. Між тым фабком працуе дрэнна, Каганэр работай фабкому не кіраваў.

20 чэрвеня на сходзе па чысткі прысутнічалі члены раённага праверкому т. т. **Балцін і Офэнгейм.** Тав. Балцін крыху ўзьняў актыўнасьць, рабочыя разьвязалі языкі і пачалі гаварыць, але надта асьцярожна.

А на заўтра, калі Балціна ня было, чыстка пашла папрэнейшаму вяла.

Камісія па чысткі павінна зараз-жа ўлічыць усё гэта. Парткалектыў павінен разгарнуць самую шырокую растлумачальную работу ў цэхах, брыгадах аб сутнасьці бальшавіцкай самакрытыкі, дабіцца ўзьняцьця актыўнасьці беспартыйных рабочых у чысткі. Гэта дасьць магчымасьць ачысьціць партыйны калектыў ад усіх тых, якія выпадкова ў яго пралезьлі, і ўзьняць работу на вышэйшую ступень.

Н. Найдзін.

Напярэдадні чысткі

За паўгадзіны „навучыў" гісторыі партыі...

Чыстка партыі ў **Горацкім** раёне пачалася. Хутка пачнецца чыстка Жданаўскай ячэйкі. Як яна рыхтуецца да гэтага?

Школа палітграматы ўвесь час не працавала, кіраўнік школы **Папсуеў** (сакратар Жданаўскай ячэйкі) тлумачыць сваю бязьдзейнасьць так: «Бачыце, у нас увесь час ня было газы, ну, а потым усім вадома, сяўба». Нарэшце, 13 чэрвеня сабралі палітгурток. Але на заняткі зьявілася толькі палова камуністаў з двух сэкцыянатаў. Нечага ня зробіш—рашыў Папсуеў і пачаў заняткі. За паўгадзіны ён «прачытаў» усю гісторыю партыі і на гэтым супакоіўся. А пімат членаў і кандыдатаў партыі: Буранкоў, Майсеей, Карнікаў, Старасьцін, Чысьцякоў і інш. як раней, так і зараз ня ведаюць праграмы і статуту партыі.

Пастанова ЦК і ЦКК аб чысткі была прапрацавана толькі 12 чэрвеня, прычым на сходзе прысутнічалі ня ўсе камуністы і амаль зусім ня было беспартыйных калгаснікаў і адпасобнікаў.

Вісакар.

Агляд друку

ЗАПЧАСТКІ—УБОРАЧНАЙ

„ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА"—Гомель і „МЭТПРОМАВЕЦ"—Віцебск

Гыхтуй сані летам, а калёсы зімой — вучыць старая прыказка. І гэта зусім правільна. Тое самае трэба сказаць і аб падрыхтоўцы с.-г. інвэнтару і машын да палявых работ. Зараз набліжаецца адказнейшы пэрыяд сельска-гаспадарчых работ — уборка ўраджаю. Тут загадзя ўсё павінна быць па сваім месцы, у поўнай спраўнасьці, асабліва ўборачныя машыны, якія па-сутнасьці будуць выконваць посьпех уборачнай на сацыялістычных палёх.

Работа гэта, зразумела, залежыць ня толькі ад саміх калгасаў, саўгасаў і МТС, якія абавязаны прывесьці ў бавую гатоўнасьць свае ўборачныя машыны. За поўную, добраякасную і своячасовую падрыхтоўку да ўборачнай у адпаўказай меры нясуць адказнасьць і фабрычна-заводзкія арганізацыі.

У вытворчай праграме заводаў сельгасмашынабудаўніцтва БССР выраб запасных частак займае вялікае месца.

Узяць хоць-бы **Гомсельмаш.** Ён выконвае вялікія заказы **Любярэцкага** заводу і **Белсельгасснабу.** Паводле дагавору з гэтымі арганізацыямі на працягу мая Гомсельмаш павінен быў выраблць 16 відаў чыгунай дэталі па 300 камплектаў да ільнацорабілак і 8.600 запасных частак да касілак і жнівярак.

Работа па выпрабу запчастак да ўборачных машын на Гомсельмашы пачалася ў красавіку, а газэта «Палеская праўда» даведалася аб гэтым толькі 30 мая. Аналізуючы прычыны марудных тэмпаў у выпрабе запчастак «П. П.» пісала:

«Уся работа на выпрабу запчастак да ўборачных машын на Гомсельмашы праводзіцца самацёкам, без належнага кіраўніцтва, без патрэбнай мабілізацыі рабочых на выкананьне ўборачнага заказу».

Газэта мае рацыю, калі абвінавачвае заводзкія кіруючыя арганізацыі ў самацёку, адсутнасьці выразнага кіраўніцтва і патрэбнай мабілізацыі рабочых. Але гэтым ні ў якой меры ня зьнімаецца віна з самой газэты, якая на працягу цэлага месяца не заўважала, што робіцца на заводзе па выпрабу запасных частак. Нават сустрэўшыся з фактам зрыву майскага заданьня, газэта не надала сур'ёзнай увагі выпрабу запчастак.

Адзначыўшы, што па Гомсельмашы работа па выпрабу запчастак праводзіцца самацёкам, «П. П.» заявіла:

«З такім становішчам згадзіцца ні ў якім разе нельга. Недаацэнцы ўборачнага заказу трэба пакласьці канец».

Згадзіцца з такім становішчам, бязумоўна, было нельга. Але адной толькі пазгодай справе не дапамогшы. Рэдакцыя абавязана была ўзьняць выраб запчастак да ўборачных машын пад свой штодзённы нагляд, як гэта яна зрабіла ў часе выпрабу запчастак да трактараў.

У другі раз «П. П.» зьвярнулася да гэтага пытаньня толькі праз тыдзень. У нумары ад 5 чэрвеня яна канстатавала, што майскае заданьне Гомсельмашам яшчэ поўнасьцю ня было выканана, а да выкананьня чэрвеньскага фактычна яшчэ ня прыступлена. Каравдей кажучы, прарыў у выпрабе запчастак паглыбляўся.

Аднак, гэта нікольні не турбавала кіраўніцтва рэдакцыі. Калі ў першым артыкуле «П. П.» «не згаджалася» з такім становішчам і грозна патрабавала «пакласьці канец» недаацэнцы ўборачнага заказу, то ў другім тэлеграмме не зьнізіўся. Яна спакойным тонам паведамляла:

«Бюро парткалектыву ў апошнія дні заняцца пытаньнем выпрабу запчастак. Вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы».

І так бюро парткалектыву толькі ў апошнія дні заняцца пытаньнем выпуску запчастак. А дзе-ж яно было і што рабіла да апошніх дзён? Адказу на гэта пытаньне на старонках газэты «П. П.» знайсьці нельга.

Пасьля гэтага зусім супакоілася. Ёй здавалася, што раз бюро парткалектыву вызначыла мерапрыемствы ды яшчэ канкрэтныя, — значыць усё пойдзе само сабой, прарыў будзе ліквідаваны, уборачная машына атрымае запчасткі.

Так ёй здавалася. Але ня так было ў сапраўднасьці. Мерапрыемствы былі вызначаны, але ў жыцьцё яны не праводзіліся. Праз дэкаду пасьля пастановы «П. П.» прымушана была заявіць пра:

«Гомсельмаш па-ранейшаму затрымлівае выкананьне заказу на выраб запчастак да ўборачных машын».

А брыгада рабкораў, дадала:

«Сакратар парткалектыву тав. Бэрнштэйн хвалюецца нам, што ў яго добра арганізавана арганізацыйна-масавая работа завод заказу для ўборачных машын, але калі мы пабывалі ў цэхах, дык аказалася, што гэта ня так. Няма сустрэчнага планаваньня, аб якім таварыш Бэрнштэйн, няма ніякіх сьляпой работы вытворчых нарад».

Ітак, завод зрывае выраб запчастак, а «П. П.» пэрыядычна раз у дэкаду павяхоўпа, фіксуе факты, фіксуе і толькі.

* * *

Зусім у баку ад барацьбы за выраб запчастак да ўборачных машын шматтыражка «**Мэтпромавец**», Віцебскага заводу «Чырвоны мэталіст». Прагледзіўшы камплекты гэтага дзіцяці, што завод «Чырвоны мэталіст» выробляе запчасткі. У маі, напрыклад, на яе старонках па гэтаму пытаньні ня было зьмешчана ніводнага радку. Нават, аналізуючы зводку выкананьня заводам прамфінпляну за май, шматтыражка не сказала ні аднаго слова аб выкананьні заданьня па запчастках.

Тое самае мы бачым і ў чэрвені. Праўда, у нумары ад 15 чэрвеня можна прачытаць, што:

«У гэтым месяцы мы павінны скончыць такі важны від прадукцыі, як акучнікі і запчасткі да ўборачных машын».

Але як ідзе выраб запчастак, што робіцца на заводзе, каб сапраўды скончыць гэты важны від прадукцыі ня толькі ў тэрмін, але і раней яшчэ ўсё гэта шматтыражка трымае ў сакрэце.

Так змагацца за выраб запчастак нельга. Аднаго толькі падкрэсьліваньня, што запчасткі — важны від прадукцыі, далёка пэрыстарчальна. Барацьба за іх своячасовы выраб павінна стаць у цэнтры ўвагі заводзкага і раённага друку на даным адрэзку часу, каб забясьпечыць поўную і своячасовую падрыхтоўку с.-г. машын да ўборачнай і іх бесьперабойную работу.

Янка Купала

НАД РАКОЮ АРЭСАЙ

1. Замест уступу

Шмат пазнаў казак
І легенд і песень
Людзі пра балота,
Пра сваё Палесьсе.

А на чуў з песьні
Пра жыцьцё Камуны,
Слаўцця камунараў,
З сваёй сакрэты думных.

Як яны ладзяць,
У глухое далі
Для ўзяцё Савэту
Славу ўрыбаўлялі.

А ня чуў я... песьні
І прыгодных сказаў,
Што і камунаркі
Йшлі змагацца разам.

Як на тамім полі
У гранадзе рабочай,
Сіл не шкадавалі
І крыві дзіночай.

А ня чуў я песьні
Пра герояў працы,
Змусілі што багну
Сабе ўзнавацца.

Як сцярэць тучы
Цяжкасьцей трывожных,
Вышлі на шлях роўны,
Вышлі шырокіна.

І ня чуў, ня чуў я
Новых гукіх песень,
Што яны спяваюць
Новае Палесьсе.

2. Аб мінулым

Крумкач лазу зьвесіў
Пад зямлянай калодай...
Прыхілілся Палесьсе
Мінулай бяды.

Было гэта калісьці —
Багніцты—балоты,
У дрэнцо ператварыла місьце,
Асоцяй, чэрты...

Ідзе чалавек там
Засмокча смугою,
Са стонам і крэктам
Загіне з душою.

Зьвер блукае дзікі
У пагоды,—у імжакі,
Жэй дзікіх клікі,
Гадзюкі, вужакі...

Мядзьведзь смокча лапу
У бярлозе санціна,
Лось висунуў храпу,
Шукае спажыны.

Дзік ходзіць з дзіцятамі,
За ім — табун воўчы.
Усталькага ліха —
У дзень бяды і ў ночы.

Там-сям чобець вужкі,
Нібы дамкіна,
Прасунецца ў грузкіх
Катлінах, багнінах.

Адно з вясной ясным
Палесьсе ўскрэсьне,
Спаткае няшчасна
Вясну і прадвесьне.

Свой сьпеў сапаўлёка
У гальлі адпачабна,
Аб шчасьці жалейка
Гарэтна ад'ёмна.

Скуча зялёна
Адвечнае куку,
Паліча бабула,
Ці шмат яшчэ мукаў.

А там зноў маўчай
Палесьсе замоўкла,
Зноў сьніць яго сіла
Пад багнай пакоўкай.

А людзі? а людзі? —
Іх мала-ня мала, —
Упаўшыя грудзі,
Бяда ўсьлед назалай.

Між тонкіх бэзлічаў,
На вядмах шапчаных,
Як на палянічны,
Рад хат, бы курганаў.

Жывуць людзі ў хатах,
Пазбуць сябе жэпці,
Каб з торбай у латах
Найсьці жабраваці.

Пад шум бесканечны
Вярозаў і сосная
Сахой подарочнай
Аруць пясок млосна.

Іх розум балота
Трымае палонна, —
Красуе цямнота,
Растуць забабоны.

Легенды і казкі
Прыгожных законаў
Паўзуць мохам вязкім,
Вагуньнем зялёным.

Праз леты і зімы
Паданьне йшло ў векі:
— Паляшукі мы,
А не чалавекі!

3. Зашумела, загуло...

I.

Зашумела, загуло,
Ды зямлятрасеньне,
На палескае сяло
Пашло утрапоньне.

Люду хмара напыла,
Покліч пташы ўзьвіўся,
Небам сіняя імгла...
Скуль яны ўзяліся?!

Украінцаў тут сурма
Й старабінцаў нашых,
Набрыло, як на кірмаш,
На багнаву пашу.

Безьлік хлопцаў-завадных,
Дзядзькаў барадатых,
Пілы вострыя ў руках,
Тапары, лапаты.

Што-та будзе тут цэнер?..
— Нічога ня будзе! —
Хітра думалі ў чацьвер
Палескія людзі.

А ў нядзелю чуць зара
Сякеры запелі,
Ад лапат балот кара
Рвецца ў тонкім целе.

Шум і гоман навакол,
Як на тым ігрышчы,
А лапаты рэжуць дол,
А сякера сьвішча.

Рыюць людзі тонкі торф
У вадзе па пахі,
А у жылах бурліць кроў —
Багна ім ня страх!

Яны знаюць, што ўжо так
Ня быць, як калісьці,
Што пакінуць яны знак
Вялікай карысьці.

За канзвай—як струна —
Новая канава, —
Усе падобны, як адна,
І зьлева і справа.

Спанаваў зьвярыну страх,
Ад людзей страх сьніць —
Па тарфяньні, па карчах,
За гонямі гоні...

На гэктары абнялі
Канавамі неры,
Далей мераць палалі
Ужо на кілёмэтры.

Магістралі прад табой —
Ня зьмерыць і вокам, —
Тарфяніцтва прад сяўбой
Блізкай, недалёкай...

Магістралі, дрэнажы
Шыхі ў багне ставяць...
Ой, дарэмна варажыў
Палянічук шаўдату!

Не дабачыў палянічук
З хаты безаконнай
Дзён надходзячых бяз мук,
Бяз трудоў прытомных.

Раскаваў балота а нут,
З дрытвы непраходнай
Гераічны вольны люд
Працаю свабоднай.

II.

І ляжаць канавы,
Тым магістралі,
На іх воды рэчкай
Уоб далей, далей...

Бягуць да Арэсы
Сярод яшчэ пустак
Цаліной балота
Залягае густа.

Магістралі складна
Шлях працерабілі,
А яшчэ шмат работы
Чалавечай сіле.

Каб зрабіць прыгоднай
Глебу ў самым дзеле,
Каб на полі роўным
Трактары запелі.

Каб высокі, буйны
На тарфяньні чыстым
Зашумеў чаротам
Колас залацісты.

Чакае Палесьсе
Людзей сьмелых, жвавых,
Каб прышлі і дружна
Узяліся за справу.

Рук яно чакае
Новых, гаспадарных,
Спаборнікаў стойкіх,
Брыгадаў ударных.

Яны хутка прыдуць,
Вогнішчы разложаць,
Да канца балота
З багны адварожаць.

Бо йдуць чуткі сільна,
Па цэлай краіне,
Што адкрыты скарбы
У балотнай пустыні.

4. Камуна

I.

Вясной зьявілася іх сем *)
Сьвет новы будаваць,
А восеняй прыйшло яшчэ
Іх семдзесят і пяць.

З Самарскае дывізіі
Было найбольш за ўсіх —
Балотных здольных пінэраў,
Ахвочых, маладых.

Прышлі і фрунзаўцы нарочаць
Супольна даліну,
На дрэмлючых спрадвеку землях
Заводзіць навіну.

Таксама і з Чапцарскай
Дывізіі ўдалой
Сюды зьявілася іх восем
Наступнаю вясной.

Жаданьне ладзіць новы лад
Сюды ўсіх прывяло;
Надзея, вера ў лепшы час
Бясацьце іх было.

Ня страшны сьмелым ім былі
Сьпякоты калады,
Асеньняя слата, імжа,
Сьніг, марозы, льды.

А Забалоцьцем той бугор
Звуў палянічук здаўна,
Дзе першы раз пану сваю
Паставіў камунар.

Балота, забалаць балот,
Як там не называй,
Але ступіў тут бальшавік —
Ён зьменіць гэты край.

Палаткі, пілы, танары
Прывалаклі з сабой
І згодна, як аднэй сям'ёй,
Пашлі ў ратучы бой.

Адны ў другіе карчуюць гаць, —
Паўзуць у верх карчы, —
Другія вараць у катлах
Ім скромныя харчы.

А трэція цягаюць лес,
Каб збудаваць барак...
У палатцы добра ўлетку жыць,
Але зімой ня так.

Карчуюць нетру дзень-у-дзень
У дождж, у пыр, у гніб;
Палаткі з імі сьлед-у-сьлед, —
Другіх няма сялёб.

За крокам крок, за метрам метр,
За гэктарам гэктар, —
Чысьцее поле тарфяніча,
У сонцы ўжо абшар.

II.

Кінець работа, як нідзе,
Гарыць зжно яна ў руках,
Што знята праца ў грамадзе,
Які палёт, які размах!

Здавалася-б, чаго хацець, —
Працуй ды весела пяй.
Але навук расстаяў сень
У камунарскае сяй'ё.

І пазіраюць з-падылба,
Як-бы тачыў на іх хто нож,
Там-сям прарвецца і клянцьба,
Скрабецца ў сэрцы нейкі омуж.

У Камуне быццам нелады,
Бы менш дабра, а болей зла...
А таго ліха, тэй бяды
Прычына простая была:

З васьмі чанцарцаў-пацарых *)
Няўдалых выйшла змагароў;
Яшчэ нявольніцкіх старых
Не пазбыліся ланцугоў.

Камуна ім была няўцям,
Трымаліся, як дзікуны;
Палатку й то асобна там
Сабе паставілі яны.

Імкнуцца быць не на віду,
Самі сабой гуляюць, сьпяць,
Ўсю неспакойць грамаду
Нягодных «камунараў» ня ць.

Работа ў іх—курам на сьмех,
Работа іх ідзе за плот,
А ня пасеешь, так пажнеш,
Такі мець будзеш умалот.

Работа валіцца ім з рук,
Ды яшчэ дзвай крупець—мупель:
Каб мабыць менш было дакук,
Аддзельна узялі сабе дзень.

Ды на «дзялянцы» на «сваёй»
Па месцы топчуцца, як цьмы:
З бязглуздай працаю такой
Не дачакацца вам пясны!

І камунарам іх цярпець
Ня стала болей ужо сіл;
Няхай пустуе лепей клець,
Чымся заводзіць у ёй пыл.

*) 1. Модзіл—цяньмоны старшыня Камуны яд пачатку не заснаваньня (1929 г.) і на сёньняшні дзень. 2. Анісімаў; 3. Восінаў; 4. Данілаў; 5. Каналь коў, 6. Коўрыкаў, 7. Шмалаў.

Камуна арганізавалася і напаўняецца з дэмабілізаваных чырвонаармейцаў Беларускай Вазенай Акругі, але ёсьць і іншыя. Па нацыянальнасьці бальшасьць—беларусы. Пералічаныя сем таварышоў фактычна і зьявіліся як-бы заснавальнікамі Камуны. Я. К.

*) Прозьвішчы іх: 1. Крыварота, 2. Прыз, 3. Раман, 4. Скарабагата, 5. Харнацаў.

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ»

Прэкурор Саюзу ССР таварыш АКУЛАЎ ІВАН АЛЯКСЕЕВІЧ.

У СНК БССР

Брыкетаваньне лясных адкідаў—новая крыніца прамысловага апалу

У лясох БССР кожны год скапляецца ад 12 да 14 млн. тон лясных адкідаў—хвоі. Калі нават часткова асвоіць гэту масу адкідаў, пераапрацаваць у брыкеты, то атрымаецца новая невычарпальная крыніца прыгоднага для абрынка-згодзэкіх каталў, паравозаў і іншых прамысловых топак апалу.

Да гэтага часу брыкетаваньне праводзілася толькі ў выглядзе вопыту ў Гусеве-Хрустальным. Вопыты пацьвердзілі вялізарнае народна-гаспадарчае значэньне гэтага мерапрыемства.

Калёрыйнасьць брыкетнага апалу ў 1,6 раза вышэй калёрыйнасьці добрых дроў і торфу. Зольнасьць вельмі малюпькая—2-3 проц., серкі няма. Ён на 20-25 проц. таней дроў і торфу і выгодны для транспартаваньня.

Апрача гэтага утылізацыя лясных адкідаў вызваляе лясную прамысловасьць ад выдаткаў па ачыстцы, зьнішчае пажэрную небясьпеку і паляпшае самы рост лесу.

БССР ВЫСТУПАЕ ПІЯНЗРАМ У РАЗГОРТВАНЬНІ Ў САЮЗЕ ВЫТВОРЧАСЬЦІ БРЫКЕТНАГА АПАЛУ. Ужо ў бягучым годзе ў БАРЫСАЎСКІМ, КРУПСКІМ, БЯГОМЛЬСКІМ, БЫХАЎСКІМ І РЭЧЫЦКІМ РАЁНАХ БУДУЦЬ АРГАНІЗАВАНЫ ПЕРШЫЯ Ў САЮЗЕ 7 БРЫКЕТНЫХ СТАНЦЫЙ. Пераапрацоўка будзе праходзіць у самым месе на месцы збору сырцу пры дапамозе перасовачных брыкетных машын.

Аб тым, якое значэньне ў гэтай справе надаецца Беларусі, гаворыць наступны лічбы. З усяго пляну загатовак хвоі ў 1933 г. па Саюзе ў 40 тыс. тон БССР павінна даць 32 тыс. тон. З заяў Наркамлесам Саюзу пляну заготоўкі брыкетнага апалу ў 16.300 тон—наша рэспубліка павінна даць 13 тыс. тон, а ўжо ў бліжэйшым годзе гэта лічба зможа быць даведзена да 300.000 тон.

Асабліва важна адзначыць, што ВЫТВОРЧАСЬЦЬ ПРЭСАЎ ДЛЯ БРЫКЕТАЎ ПЕРШАЙ АСВОЙВАЕЦЦА НА МЕНСКІМ МАШЫНАБУДАЎНІЧЫМ ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА. Вараш-ры асноўныя будаўнікі гэтых прэсаў у Саюзе, выпусьцяць у гэтым годзе 40 машын. Першая з іх будзе ўстаноўлена ў лістопадзе. Прадукцыйнасьць кожнай машыны — 6.000 тон.

У бягучым годзе загатоўка хвоі будзе праводзіцца пры дапамозе грабель. Але ўжо будуюцца спэцыяльныя машыны для збору хвоі. Распрацоўваецца канструкцыя спэцыяльнай машыны па пераапрацоўцы лясных адкідаў у вугольныя брыкеты (штучны каменны вугаль).

Для дапамогі ў арганізацыі гэтай справы ў Менск прыехалі дырэктар Саюздрэўбрыкету тав. РАВІКОВІЧ і вядомы спэцыяліст па брыкетаваньні прафэсар МАРЦІНАЎ.

Саўнарком БССР у пастанове па гэтым пытаньні падкрэсьлівае вялізарнае значэньне гэтага мерапрыемства для народнай гаспадаркі. РВК, саветам прадпісвае аказаць Белдрэўбрыкету практычную дапамогу ў арганізацыі станцый і кадры рабочай і гужсілы.

Саўнарком абавязаў завод імя Варашылава забясьпечыць свалачасовы выпуск прэсаў, а Белдрэўбрыкет бездаволна прыступіць да арганізацыі станцый і загатоўкі хвоі.

У гэтай вялікай справе, асабліва ў загатоўках хвоі, павінны аказаць дапамогу ўсе грамадзкія арганізацыі, у першую чаргу, камсамол і калгасная грамадзкасьць.

ЗЛАМАЦЬ МАНІЛАЎШЧЫНУ І БЮРАКРАТЫЗМ

(Да пленуму ЦП саюзу працасьветы)

XVII партканфэрэнцыя з усёй выразнасьцю падкрэсьліла, што: «Ажыцьцяўленьне праблемы кадраў ёсьць важнейшы элемэнт большавіцкага ажыцьцяўленьня задач культурнай рэвалюцыі і пасьпяховага будаўніцтва сацыялізму». Нам патрэбны людзі, якія былі-б здольны арыентавацца на ўсёй сыстэме сацыялістычнай вытворчасьці.

І, калі мы гаворым аб перамаганьні перажыткаў капіталізму ня толькі ў эканоміцы, але і ў сьвядомасьці людзей, з усёй выразнасьцю высоўваецца роля нашай палітэхнічнай школы, роля настаўніка.

Пленум ЦП саюзу працасьветы выбіраецца якраз у той час, калі наша масавая школа закончыла навучальны год у першы год другой пяцігодкі, у той час, калі пасьля ўсесаюзнага і ўсе беларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў мы зьяўляемся сьведкамі яркай і магутнай дэманстрацыі вытворчай актыўнасьці і вялізарнага росту палітычнай сьвядомасьці мільённых мас калгасьнікаў.

ЦП саюзу працасьветы кіруе 35-тысячнай арміяй асьветнікаў. Першае пытаньне работы пленуму — вынікі пасоўнай кампаніі і задачы прапалачэньня-папаравай кампаніі—прадпісаньне нашаму саюзу рахунак: як-жа мы кіравалі, працавалі і якія маем вынікі. Трэба сказаць, што асноўная маса асьветнікаў БССР уключылася ў сяўбу сапраўды баявым фронтам.

Возьмем прыклады з **Уваравіцкага раёну**, дзе настаўнікі **Ефімчык, Манько, Вавоў** праводзяць сыстэматычную работу ў 7 брыгадных і 2 аўтыльна-калгасных насьпецгазэтах. Настаўнік **Ефімчык** правёў 2 курсы для 58 брыгадзіраў і конюхаў, ім-жа сабрана 20 рацыяналізатарскіх прапаноў.

У Чэрвеньшчыне—81 настаўнік прымалі ўдзел у давядзеньні да двара пасеўпланаў, кіравалі 34 атрэзоатэхгурткамі, кіравалі дашкольнымі курсамі, праз якія прапушчана 28 калгасьніц.

Па Асьвейскаму раёну на 6 курсах (брыгадзіраў, паляводаў, рахункаводаў, конюхаў) працавала 16 настаўнікаў у парадку грамадзкай работы.

Па ўсёй БССР настаўніцтва ў часе веснавой сяўбы працавала ў 2.515 агра зоатуртках, арганізавала 217 новых дзіцячых устаноў, выпушчана 8.095 на сьценгазэт у калгасах, сабрана 27.433 тон попелу, выпрацавана 3.659 вытворча-фінансавых пляноў у калгасах, прынята ўдзел у 1.289 кантрольна-сыгнальных пастох. Адным сельска-гаспадарчай літаратуры настаўніцтва распаўсюдзіла на 47.135 руб.

Праўда, ёсьць і такія раёны, як **Бягомль, Бешанковічы, Смалявічы, Брагін, Заспаўе, Ветка, Рэчыца, Жлобін, Нароўля, Сіроціна, Дуброўна і Чачэрск**, дзе РК саюзу ня здолелі мабілізаваць масы настаўніцтва на ўдзел у сяўбе.

Клясавы вораг, пралезны ў нашы культурныя ўстановы, праводзіць сваю шкодніцкую работу, а бывае так, што нашы «інструктары» абыходзяць такія пытаньні.

Ці мала прыкладаў працягваньня ў нашых школах рэлігійных, нацдэмаўскіх ды іншых контр-рэвалюцыйных «тэорый?» За што зьнята настаўніца Менскай школы Альпярэвіч? Затое, што яна правяла ўрэйскі пазьнім. У 15-й школе, доўгі час квітнеў антысэмітызм, на які ніхто не рэагаваў, накуль ЦП не ўзялося за гэту справу. На Мацілеўшчыне настаўніца Шаўцова стаўіла вучняў у куток. У чыгуначнай польскай школе забаранілі пісаць заметкі на беларускай мове. У Воргачаўскай школе сярод вучняў папіраліся антысэміцкія анэкдоты. У Васілеўцкай школе многія вучні пасьвіскалі парку.

Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат. Яны перш за ўсё гавораць аб тым, як прыгнечана клясовая пільнасьць некаторых работнікаў на месцах, якія ня здолелі своечасова выкрыць мануэўры клясава-варожых элемэнтаў, што пралезьлі ў школу.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што інтэрнацыянальна-клясавае выхаваньне і антырэлігійная прапаганда ў некаторых школах пастаўлены зусім дрэнна.

Некалькі слоў аб іспытах. Асноўная настаўніцкая маса з вялікім уздымам правяла падрыхтоўчую работу да правядзеньня іспытаў — першай самаправеркі і праверкі ведаў вучняў. Але ў некаторых школах не зразумелі як след пытаньня аб іспытах і хацелі іх пераправіць у старыя экзамэны.

Правядзімая пэратарыфікацыя апараты прапы настаўнікаў паказала, што вялікі процант апошніх патрабуе перакваліфікацыі, а ў гэтым напрамку арганы нарасьветы ня ўсё робяць для таго, каб склесьці належныя ўмовы для настаўніка, каб ён зможа павышаць сваю кваліфікацыю як праз заочнае навучаньне, так і праз наведваньне гурткоў і работы настаўніцкіх брыгад.

Нельга абыйсьці і пытаньня матэрыяльна-прававога становішча настаўнікаў. Па радзе раёнаў БССР ёсьць шмат фактаў грубага парушэньня дырэктыў партыі і ўраду па матэрыяльным забесьпячэньні асьветнікаў, асабліва ў гэтым напрамку адрозьніваюцца ад усіх раёнаў наступныя: **Чэрвень, Хойнікі, Пухавічы, Ельск, Горкі, Талачыно, Уваравічы, Гомель, Прапойск, Лепель, Менск, Крупкі, Клічаў, Карма, Буда-Кашалёва, Сянно, Чырвонапольле, Церахаўка, Гарадок, Магілеў, Жыткавічы, Расоны, Капыль, Глуск, Быхаў, Борша, Дзяржынск.**

Адсутнічае належная работа РК саюзу працасьветы, адсутнічае бальшавіцкая барацьба за паляпшэньне матэрыяльна-бытавога становішча настаўніцтва з боку райпрафарганізацыі. Замест таго, каб самім узяцца за гэту справу, высьветліць недахопы, паставіць гэта пытаньне ў адпаведных органах, справа пускаецца на самацёк.

Многія настаўнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі на лепшую рэалізацыю пастановы партыі аб школе, за лепшы ўдзел у правядзімых кампаніях, але некаторымі райкомамі творчы ўздым асьветніцкіх мас ня быў падхоплен.

Я больш спышуся на нашых недахопах з тэй мэтай, каб на падставе гэтых канкрэтных фактаў зламаць калчаткова манілаўшчыну і бюракратызм у рабоце некаторых нашых раённых прафарганізацый працасьветы з тым, каб, падвёўшы вынікі навучальнага году, з усёй рашучасьцю ўзяцца за падрыхтоўку да новага навучальнага году.

Неабходна **ЗАРАЗ-ЖА** разгарнуць работу па кантролі над рамонтам і будаўніцтвам школ. **Будаўніча - рамонтная кампанія зацягваецца.** Тут патрэбен круты паварот, а гэта справа можа выправіцца толькі тады, калі раённыя арганізацыі працасьветы ўмяшаюцца, мабілізуюць працоўнае насельніцтва на дапамогу школе. Мы павінны ажыцьцявіць органы нарасьветы, мы павінны прывабіць думку і непасрэдны ўдзел бацькоў вучняў і пэдстаўчых арганізацый. Трэба рашуча стаўіць пытаньне аб арыўчыках рамонтна-будаўнічай кампаніі ў адпаведных органах. **За школьнае памяшканьне, за абсталяваньне школы, за пэдагога трэба весьці барацьбу з такой бальшавіцкай настойлівасьцю, з якой краіна вядзе барацьбу за хлеб, вугаль, за мэталь.**

З боку цэнтральнага праўленьня саюзу, хоць і з некаторым спазьненьнем але прыняты захады і аказана канкрэтная дапамога Наркамасьветы і ДВБ па выданьні падручнікаў. На сёньняшні дзень ёсьць каля 10 падручнікаў, якія павінны быць своечасова прасунуты ў школы. Але гэта справа на сёньняшні дзень патрабуе каб прафсаюзная арганізацыя на месцы заражэ арганізавала кантрольныя пасты і паставіла перад сабой задачу, што яна сапраўды адказвае за своечасовую дастаўку падручніка ад рабінпата цэнтру да школы.

Неадкладнай задачай прафарганізацый па падрыхтоўцы да новага навучальнага году зьяўляецца штодзённая бальшавіцкая клапатлівасьць у спэрэчэньні базы па бесперабойным забесьпячэньні прадуктамі харчаваньня і прамтаварамі настаўніцтва да новага навучальнага году. Што тут трэба зрабіць? Зараз-жа правяраць і заключыць дагаворы з калгасамі на стварэньне фондаў па забесьпячэньні. Своечасова ўбраць прыгарадныя гаспадаркі, прышкольныя вучасткі з тым, каб усе прадукты былі мэтазгодна скарыстаны. Зараз-жа неабходна будзе правяраць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду па забесьпячэньні настаўніцтва на летні перыяд і па выдачы ім зарплаты.

Адным з галоўных задач рэвізіраванняй працасьветы зьяўляецца ўмелая арганізацыя адпачынку настаўніка ў летні час. Асноўная маса настаўнікаў застаецца на сваіх месцах. Яны будуць прымаць актыўны ўдзел у правядзеньні і ўборачнай кампаніі, але гэту работу трэба разумна спалучыць з адпачынкам і асабліва тых асьветнікаў, якім трэба павысіць сваю кваліфікацыю.

Пры ўкамплектаваньні школ новымі педагагічнымі кадрамі нашымі прафарганізацыямі павінна быць праяўлена асабліва пільнасьць, памятаючы, што разьбіты клясавы вораг зьмяніў тактыку клясавай барацьбы. У нас не хапае кадраў і гэта дае магчымасьць чужому элемэнту абабраць пралезьці ў школу. Усё гэта патрабуе ад прафарганізацыі працасьветы праўленьня бальшавіцкай пільнасьці ў часе ўкамплектаваньня школы.

Да пачатку новага навучальнага году засталіся лічаныя дні — толькі два месяцы. Мы падрыхтуемся да яго з поспехам толькі тады, калі праца будзе набудавана плянава, з сыстэматычным кантролем над выкананьнем тых бальшых задач, якія зараз стаяць перад органамі Наркамасьветы і ЦП саюзу працасьветы і яго мясцовымі зьвяньнямі.

А. Нікагасаў.

Вялікадзяржаўніцкія вылазкі ў МПІ

Чэрвеньская заліковая сэсія, якая праводзіцца зараз ва ўсіх ВНУ, выкрыла нядаўна на завочным сэктары Менскага Педагагічнага Інстытуту настрої яўна вялікадзяржаўна-шавіністычнага парадку.

Студэнт-завочнік III-га курсу літфаку СКАБЕЙ (між іншым ён займае пасаду загадчыка навучальнай часткі клімавіцкага рабфаку), знаходзячыся ў інтэрнаце, заявіў у прысутнасьці групы студэнтаў:

— Няўжо мы павінны па курсе беларускай літаратуры вывучаць усіх гэтых «пісталетаў»?

Пад «пісталетамі» вялікадзяржаўнік Скабей разумеў такіх пісьменьнікаў, як Кузьма Чорны і інш.

Удзельнікам гутаркі студэнтаў наконт навучальных праграм быў загадчык навучальнай часткі завочнага сэктару МПІ РЫДЗЕЎСКІ, які ня толькі ня даў належнага адпору спробам зганьбіць выдатнейшых савецкіх пісьменьнікаў БССР, але цалкам салідарызаваўся са Скабеем. Больш таго, Рыдзеўскі знайшоў, што з праграм варта было-б выкінуць такое «непатрэбства», як паэму А. Александровіча «Цені на сонцы» (!)... Характэрна, што загадчык навучальнай часткі знаходзіць патрэбным выкінуць іменна гэты, найлепшы твор Александровіча, твор, працяты клясавай нянавісьцю як да нацдэмаў, так і да вялікадзяржаўных шавіністаў, адзін з лепшых твораў беларускай пралетарскай літаратуры.

Група студэнтаў, якія знаходзіліся ў той час у інтэрнаце МПІ, не дала бою гэткім «настройчыкам» свайго выхаваўцы, як не дала бою і вылазцы шавініста Скабея.

Змазала, па сутнасьці, гэтае клясаварожае выступленьне вялікадзяржаўнікаў і катэдра літаратуры МПІ, у прыватнасьці загадчык яе, праф. М. Піотуховіч, які на пасяджэньні катэдры «ўспомніў», што ў студэнта Скабея памянёны выпадак — не памылка, а сыстэма поглядаў.

Агульны сход студэнтаў завочнікаў МПІ, якія зараз у Менску здаюць залікі, даў правільную ацэнку выступленьням Скабея і Рыдзеўскага, як выступленьням клясава - варожых, якія ідуць з лягеру вялікадзяржаўнага шавінізму.

Але становішчам вучобы, якасьцю марксыцка-ленінскага выкладаньня на завочным МПІ павінен у самым хуткім часе зацікавіцца Наркамасьветы.

Юр. Л—ны.

Ачысьціць тэхнікум ад спэкулянтаў

(Ліст студэнтаў)

Віцебскаму тэкстыльнаму тэхнікуму Белтэкстыльабъяднаньне адпусьціла 25 тыс. руб. для паляпшэньня матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў і харчаваньня. На частку гэтых сродкаў адміністрацыя тэхнікуму адчыніла буфэт.

Загадчыкам буфэту пачаў працаваць старшыня прафкому Хаўкін, а буфэтчыкам член прафкому Бэрман (ён-жа член камісіі па праверцы работы буфэту). Такім чынам, кантроль за працай буфэту быў у руках самім-жа буфэтчыкаў. У выніку гэтага Хаўкін і Бэрман пачалі займацца спэкуляцыяй. Напрыклад: хлеб адпускаўся ў буфэт па 2 руб. 50 кап. за кілё, а прадаваўся студэнтам па 4 руб. 25 кап. Пячэньне прадавалася па 4 руб. 80 кап., тры сабекопце ў 3 руб. 25 кап. Рахункі за пастачку прадуктаў часта даваліся фальшывыя. Былі выпадкі расьцягваньня прадуктаў.

Напрыклад: адпушчаныя для буфэту 11 кгр. цукерак буфэтчыкі падзялілі паміж сабою. Усе гэтыя факты былі выяўлены праверачнай камісіяй, якую вылучыла партарганізацыя. Партыйна-камсамольскі і студэнцкі актыў на сходзе вынес пастанову выключыць спэкулянтаў Хаўкіна і Бэрмана з тэхнікуму. Але-ж дырэктар Рабкін і сакратар камсамольскага калектыву Богад змазалі пастанову, якую вынес сход. І да гэтага часу спэкулянты з тэхнікуму ня выключаны. Такія адносіны дырэктара Рабкіна патурающь злачынствам і спрыяюць адсову студэнтаў.

Мы лічым, што спэкулянтам не павінна быць месца сярод пралетарскага студэнцтва і патрабуем ад Віцебскай КК-РСІ ачысьціць ад іх наш тэхнікум.

Тэкстыльшчыкі.

Аматары цеганіны

(Ліст калгасьніка)

У 1932 годзе я працаваў старшынёю калгасу імя Шаўчэнкі, Аксінскага сельсавету, Нараўлянскага раёну. Пасьля перавыбараў праўленьня калгасу я працаваў радавым калгасьнікам.

Па спэцыяльнасьці я дрэвалапраўшчык і калі ў калгасе імя Шаўчэнкі мне не знайшлося належнай працы, то я з дазволу праўленьня перайшоў у калгас «Чырвоны Араты», Беразоўскага сельсавету, Мазырскага раёну. Цяпер я працую ў гэтым калгасе сталяром.

У калгасе імя Шаўчэнкі засталося 96 выпрацаваных мною працадзён за 1932 год. Пасьля фармэрскаваньня ўраджаю я зьвярнуўся ў гэты калгас, каб атрымаць прадукты за свае працадні. Праўленьне чамусьці залічыла мяне латуном і адмовіла выдаць прадукты, спасылаючыся на працадні пропусы. Такім чынам я шмат разоў хадзіў у калгас імя Шаўчэнкі і ў Нараўлянскае Райза за 60 кілямэтраў, але і да гэтуль нічога не магу дабіцца.

Рудзянка Аляксандр.

Зьвязда чакае ад Нараўлянскай РКК-РСІ паведамленьня аб прынятых мерах па гэтым лісьце.

Аздаравіць работу Асінаўскага сельсавету

(Ліст калгасьніка)

Старшыня Асінаўскага сельсавету (Чаўсскі раён) Ярмоленка зрослся з кулакамі і ва ўсёй рабоце абаранне іх інтарэсы. Па яго намаганьні ў калгас «Спатлівы прыліў» прынятыя кулакі **Фралоў Уладзімер, Сокалаў Якаў і Кармызаў**, якія мелі раней па 30 і больш га зямлі, 5 кароў, 6 коняй і трымалі ўвесь час батракоў. Фралоў на працягу 10 год гандляваў коньмі.

Зараз старшыня с-с Ярмоленка пасадзіў на пасторы ў кулака Фралова, дзе амаль кожны вечар зьбіраюць да Сокалаў і іншыя і наладжваюць п'янкі.

Па рэкамэндацыі Ярмоленкі гэта кулацкая зграя сумела нават прадзіраці на працу ў Асінаўскі с-с.: Сокалаў працуе сакратаром с-с, а Кармызаў рахункаведам.

Самакрытыка па с-с у загоне. Калі на адным з пленумаў с-с актыўная селькорка Захарэнка Кулёна (заг. хаты чытальні) выступіла з крытыкай дзейнасьці Ярмоленкі, дык ён забараніў старшыні сельсакыўтаварыства выдаваць ёй прадукты. Невядома, на якіх падставах яе прадукты атрымлівае зараз заможнік Шамбалаў.

Работа ў с-с Ярмоленку на турбуе, у выніку сяўба і асабліва сяўба ільну ня скончана і да сёньняшняга дня. Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Другая пяцігодка» выканана толькі на 50 проц.

Аб «рабоце» Асінаўскага с-с сельсоры пасылалі шмат допісаў у раённую газэту, але патрэбных выводаў раённымі арганізацыямі ня зроблена і да гэтага часу.

М. Знаёмы.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» патрабуе ад Чаўсскага РВК тэрміновых мер па аздараўленьні работы Асінаўскага сельсавету. Аб прынятых мерах просім паведаміць у рэдакцыю.

Дзесяць год Бурата-Мангольскай АССР

ЦВК і СНК Бурата-Мангольскай АССР

Прэзыдыум ЦВК БССР горача вітае ў вашай асобе працоўныя масы Бурата-Мангольскай АССР з дзесяцігодзьдзем існаваньня рэспублікі.

Бурата-Манголія—адна з найбольш прыгнечаных і эксплёатаваных калёній былой царскай Расіі—у рэзультаце правільнага ажыцьцяўленьня пад кіраўніцтвам кампартыі і правадыра партыі і рабочае клясы тав. Сталіна ленінскай нацыянальнай палітыкі, у рэзультаце пастаяннага магутнага кіраўніцтва і садзейнасьці з боку Савецкага саюзу дабілася вялізарных посьпехаў у справе гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва, стаўшы яркім прыкладам перавагі савецкага ладу для ўсіх прыгнечаных народаў Дапёнага Ўсходу.

Горача вітаючы рабочых, калгасьнікаў, саветы і ўсіх працоўных Бурата-Мангольскай АССР з дасягнутымі посьпехамі, прэзыдыум ЦВК БССР выказвае ўпэўненасьць у тым, што Бурата-Мангольская АССР і ў далейшым будзе з посьпехам ісьці па шляху сацыялістычнага разьвіцьця на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі, у рашаючай барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць пралетэньняў мясцовага нацыянал-дэмакратызму.

Няхай жыве сацыялістычнае разьвіцьцё культуры і гаспадаркі Бурата-Мангольскай АССР!

Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве УсеКП(б) і яе правадыр тав. СТАЛІН!

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Германскія „пратэсты" супроць налёту таямнічых самалётаў

Ангельскі друк ня верыць у праўдзівасьць фашысцкіх паведамленьняў

ЛЕНДАН, 27 (БЕЛТА). Прабуючы даказаць усяму сьвету, што «таямнічыя самалёты», якіх ніхто ня бачыў, сапраўды раскідалі 23 чэрвеня над Бэрлінам лістоўкі, германскі ўрад зараз багата снабжае замежных карэспандэнтаў матэрыялам аб «пратэстах» розных абласных і гарадзкіх улад па ўсёй Германіі.

З **Жэнэвы** паведамляюць, што сакратарыят Лігі нацый і канфэрэнцыя па разбраеньні атрымалі каля 70 такіх «пратэстаў».

Лёндаўскія газэты, аднак, не пераконаны гэтым новым «доказам» і паранейшаму суправаджаюць паведамленьні сваіх карэспандэнтаў гіранічнымі загалоўкамі.

«Таймс» у перадавой гіранічна выказвае дапушчэньне, што германскія газэты, напэўна, былі зьдзіўлены, што іх уласныя карэспандэнты і агэнцтвы друку «поўнасьцю праявілі такое незвычайнае здаровьне». Жэнэўскі карэспандэнт **«Манчэстэр Гардыян»** піша, што «Герынг і Гебэльс, відавочна, пашыраюць свае мэтады ўнутранай прапаганды ў галіну міжнародных зносін».

Арышты рэвалюцыйных рабочых у Германіі

БЭРЛІН, 27 (БЕЛТА). У лесе каля **Гамбургу** нацыянал-сацыялісты зрабілі аблаву на сход рэвалюцыйных рабочых. 30 чалавек арыштавана. У **Дзюсэльдорфе**, згодна паведамленьня агэнцтва «Конты», паліцыя нібыта напала на сьлед цэнтру Ніжнярэйнскай камуністычнай арганізацыі і яе «бюро друку». Большая частка членаў арганізацыі, паводле заявы агэнцтва, арыштавана.

Цьвёрдалобыя стараюцца пахаваць савецкі праект.

Прыгавор па справе чэскіх фашыстаў

Прага, 26 (Белта). Суд у **Брно** вынес прыгавор па справе 58 чэскіх фашыстаў, абвінавачаных ва ўзброеным нападзе на казарму ў **Зідэніцы** (каля Брно) уночы 22-га студзеня. 45 абвінавачаных прыгавораны да турмы ад 6 месяцаў да 4 год. Галоўны абвінавачаны—лейтэнант запасу **Кобэінэк** прыгаворан да 6 год турмы. Пляменьнік былога генэрала Гайды **Гедль**, які ўцёк у свой час заграніцу разам з Кобэінэкам, прыгаворан да 6 месяцаў турмы. 11 абвінавачаных, у тым ліку б. генэрал Гайда, апраўданы.

* * *

ПРАГА, 28 (ТАСС). Апраўданьне галоўных натхняцеляў нападу фашыстаў на казарму каля **БРНО** на чале з былым генэралам **ГАЙДОЙ** зьбянтэжыла нават частку буржуазнага друку. **«ЛІДОВЕ НОВІНЫ»** піша: «Гэты прыгавор заахвочвае фашыстаў да далейшай агітацыі». Толькі сацыял-дэмакратычная **«ПРАВО ЛІДУ»** безагаворачна ўхваляе прыгавор. Камуністычныя газэты, праводзячы паралель паміж Чэхаславакіяй і Германіяй, указваюць, што пачуцьцё беспакаранасьці разьвязала руки нацыянал-сацыялістскім бандам Германіі, якія рыхтавалі пераварот. Тое самае адбываецца ў Чэхаславакіі. Вызваленага Гайду фашысты ў Брно закідалі кветкамі.

Стан аблогі ў Сафіі

Вострыя рэпрэсіі супроць рэвалюцыйнага руху

ВЕНА, 28 (ТАСС). Абяшчаньне стану аблогі ў Сафіі і іншых гарадох Баўгарыі палякорам афіцыяльнаму матыву аб ліквідацыі тэрарыстычных груп унутры македонскага руху, з усёй сілай абрушылася на рэвалюцыйны рух працоўных Баўгарыі.

У Сафіі **«невядомымі» ЗАСТРЭЛЕНЫ 7 ЧАЛАВЕК.** Сярод іх былы дэпутат баўгарскай рабочай партыі БАЯДЖЫЕЎ і актывіст незалежных прафсаюзаў Баўгарыі ТОЖЭЎ. «Невядомымі» кінута бомба і разбурана друкарня. Югаслаўская ўрадавая газэта «Палітыка» піша: «Закон супроць палітычных забойстваў і масавых аблаваў зьяўляюцца ашуканьнем народных мас Баўгарыі, а таксама ашуканьнем Югаславіі і яе саюзьнікаў, патрабуючых роспуску прыхільнікаў Міхайлава (міхайлаўцы арыянтуюцца на Італію і прапаведуюць перагляд мірных дагавораў) і спыненьне тэрарыстычнай барацьбы супроць прыхільнікаў Пратагерава (пратагераўцы абараняюць збліжэньне з Югаславіяй пад апекай Францыі). Па сведках газэты меры баўгарскага ўраду маюць мэтай затушаваць сувязь міхайлаўцаў з генштабам Баўгарыі і радам выдатных членаў ураду.

* * *

ВЕНА, 28 (ТАСС). Згодна паведамленьня баўгарскай паліцыі ў САФІІ за адзін дзень стану аблогі арыштавана 1.200 ЧАЛАВЕК, З ІХ 1.100 МАКЕДОНЦАЎ РОЗНЫХ НАПРАМКАЎ І 100 КАМУНІСТАЎ. Канфіскавана шмат вінтовак і іншай зброі. Падобныя-ж аперацыі праведзены войскамі ў Варне, Бургасе, Плоўдзіве і іншых буйных гарадох. Апячатаны ўсе друкарні. На выцца ні адна газэта. Чыгуначныя зносіны прыпынены.

Хвалюецца люд малады,
Скліканы сход аднаго дня,
На сход прышоў, як заўсёды,
Таварыш Модзін—старшыня.

І слова ўзяў і кажа так:
— «Тут ня прыстанішча ў нас
Для гультаяў і для гулак,
А месце для працоўных мас

Мо' й смачны хлеб вам дарымаю, —
Малай-ж такім цяга!
Камуне не патрэбны вы,
Бяз вас абойдзецца яна».

Адзін з пяцёх:

— Ды як-жа так
Працуй, працуй,
Адно бачно,
У дрыгве начуй.

Ні табе сон,
Ні ў час яда,
Сячэ комар,
Сьмярдзіць вада.

Адзін з намунараў:

— А што-ж вы мо' хацелі-б
Пуховае пасьцелі?
Тарэлкі яйц буталек,
Як-бы дзе на вясельлі?

Каб не сяжае бліноў і сала
Гара ніжная ляжала,
Ды не рабіць зусім нічога
Ні для сябе, ні для ні кога?

Другі з пяцёх:

— Ты контрафайдаў
Нам не мілі,
Свабодных земляў
Шмат на зямлі.

Ня трэба нам
Тваіх баек,
Дзе ня сам
Паломіць чорт.

Адзін з чэнгарцаў:

(да пяцёх)

— Як вам ня сорам, як ня стыд,
Сябе так весьці між братвы?
Чэнгарцы вы дасюль былі
І не чэнгарцы тяжо вы!

Як добрых тутка вас прыняў
Камуны вольнай калектыў,
Каб вольна, згодна, біз прынук
З балота йсьці да яснаты.

І праўду кажа старшыня,
Да слоў яго і я дадам:
Вы нашай адрадзілі сям'і, —
Ня месца ўжо ў Камуне вам!

Другі з камунараў:

— Ды што з імі цацкацца,
Ды што валаводзіцца,
Бяз гэткіх камуністыкаў
Камуна абойдзецца!

Ня нам з адпічанепцамі
Такімі ўжо братацца,
З наўдалай «брыгадаю»
Пара нам рассвацацца.

Трэці з камунараў:

— Пад партыйным кіраўніцтвам
Працуем на якасьць,
Нам урад ідзе на сустрач
І наша грамадзкасьць.

За ўсім кранка назіраем
Вокам гаспадарскім,
І мігрэпэжыць не дазволім
Лад наш камунарскі.

Ці то лодыр, ці прагульшчык —
Тут ня жыць такому...
Забірай манаткі з хаты,
Выбірайся з дому!

Старшыня Модзін:

— Таварышы, цішэй!
А то ўжо ідта громка,
У нашай грамадзе
Яно як-бы ня ёмка.

З усіх вашых прамоў
Мне ясна тут адно:
З Камуны тр' было
Іх выключыць даўно.

Але, як проста кажуць,
Лепш позна, як ніколі;
Я галасую справу,
Як быць тут—наша воля!

Хто «за», за выключэньне, —
Прашу падняць тых рукі,
Хто проць, хто устрымаўся? —
Няма! Бяз ніякай мукі

Прайшло аднагалосна,
Каб выключыць за «панскасьць»
З Камуны пяцёрых тых
З дывізіі Чапгарскай.

Чэнгарты з камунараў:

— Ды выдаць ім паперы
І прыпісаць за кару,
Каб іх ў Саюзе знали,
Што з іх за камунары.

. . . . . .

А траіх чэнгараўцаў
Працуе й сягоньня
На тых раскаваных
Камунарскіх гонях.

III.

Як з плеч гара зваліцца
З лягёгкай гэнай зьнай,
З «пяцёркай» расьвіталіся
І далей зноў за справу.

У думках прасьвятлелася
У камунараў нашых,
Камуне нова-створанай
Разлад ужо ня страшны.

Кініць работа цяжкая
Ад раньні і да ночы.
Ніхто ня йдзе з дакорамі,
Такі ўжо люд рабочы!

Загон балотны шырыцца,
Ачышчаным з карэньня,
Іграюць пілы пільшчыкаў —
На дошкі ідзе бярвеньне.

Адны рыхтуюць торфішча
Для севу біз упынку,
Другія дрова звозкае
Пад новыя будынкі.

Цягнулася так месяцы
Ды вынялыла такое,
Што не хапае нечага
Камуне маладое.

Яны ўсе агляделіся,
Што ў іх няма жанчынаў,
Што так без гаспадыніных
Рух трудна жыць мужчынам.

* * *

Сход. На сходзе, як звычайна,
Старшынёй таварыш Модзін;
З чэйкай думкаю патайнай
Сход вачыма ёц абводзіць.

— «Буду коратка мець слова, —
Кажа ён, як-бы меў клопат:
Для Камуны нашай новай
Жанчын трэба, ну і ўсё тут!»

— Трэба! трэба! — стогалосна
Загучэла гулка маса,
Ажно рэха пашло ў соснах
Ад тэнораў і ад басаў.

— Таварышы! крычыць Модзін,
— Так прыняць! нашто час траціць?
І прынялі і пяводзін
Проць ня меў чаго сказаці.

— «Дык вось,—Модзін далей кажа:
На чарзе да дому едзьце,
І хай кожны з вас разважа,
Як і што мець на прымеце.

Пакінуўце гаспадаркі —
Парасят, авечак, коні,
І прывозьце у Камуну
Камунаркі, хоць сягоньня.

Хто жанаты, вязі жонку —
Без падушкі, ці з падушкай;
Хто ня мае жонкі, звонку
Пашукай сабе падружку».

Посьле гэтакай прамовы
Ідуць весела да хаты,
Усе дзяўольны з пастановы —
Нежанаты і жанаты.

І жаніцца, дык жаніцца, —
Баяцы рады пастараецца, —
Сьвятлей будзе у сьвятліцы,
Начай пойдзе ў поні праца.

А ў рабоце на балоце
Не мапал будзе помач,
Бо жанчына пры ахвоце
Не пядасца ўжо нікому.

* * *

Шум і гоман вакол,
А што за навала?
То Камуна ужо
Удвойчы большай стала!

І работа пашла
Там спарней удвое,
Камунарскі народ
Кодзіць буйным боем

Ідзе ў сьвет новы год —
Дзевяцьсот трыццаты,
Які-ж будзе, які:
Бедны, ці багаты?

Бягуць дні, як вада,
Сьнег ужо выходзіць, —
Сваё права вясна
На зямлі заводзіць.

Лес зялёны шуміць
Песьнямі заліўся,
Над палянкай цьвірчаць
Жаўрукі у высі.

А ў Камуне, гадзі,
В

Ліст выканкому камінтэрну ангельскай незалежнай рабочай партыі

ЛЁНДАН, 28. (БЕЛТА). Камуністычная «ДЭЙЛІ УОРКЕР» публікуе ліст кратарыяту Выканкому Камінтэрну цыянальнаму савету Незалежнай Рабочай партыі. Гэта партыя прасіла Выканком Камінтэрну паведаміць, як мож на на практыцы ажыццяляць рэзалюцыю кангрэсніцкі Незалежнай Рабочай Партыі ў Дэрбі аб жаданьні НРП садзейнічаць рабоце Камінтэрну. Сакратарыят Выканкому Камінтэрну ўказвае на наступныя меры садзейнасьці рабоце Камінтэрну: «Па-першае, пашырэньне і ўмацаваньне салідарных выступленьняў НРП і КПА (кампартыя Англіі) па ўсіх актуальных пытаньнях барацьбы ангельскага і міжнароднага пралетарыяту; па-другое, сапраўднае падтрыманьне ў барацьбе кампартыі Англіі супроць буржузана-нацыяналістычнай і рэакцыйнай палітыкі нацыянал лейбарыстаў, супроць рэфармісцкай палітыкі лідэраў лейбарыстыкай партыі, лідэраў трэд'юніёнаў і другога інтэрнацыянальну. НРП ня можа абмежавацца арганізацыйным разрывам з другім інтэрнацыяналам. Барацьба супроць наступленьня капіталу застаецца пустою фразаю, калі партыя нічога не прадпрыймае для мабілізацыі рабочых на масавае супраціўленьне зьніжэньню зар платы і дапамог па беспрацоўі, звальненьням і г. д. Барацьба супроць фашызму застаецца фальшывай фразай, калі гэта барацьба не суправаджаецца арганізацыяй адзінага фронту рабочай клясы супроць фашысцкага наступленьня. Барацьба супроць імпэрыялізму і войн, якія ім падрыхтоўваюцца, застаецца пустой фразаю, калі ня імкнуцца настойліва і добрасумленна мабілізаваць рабочую клясу на няпрымірымую барацьбу супроць імпэрыялізму ва «ўласнай» краіне. Сацыял-дэмакратыя праводзіць імпэрыялістычную палітыку буржуазіі і далучылася да антысавецкага фронту, і таму ня можа быць і гутаркі аб садзейнасьці барацьбе Камінтэрну супроць наступленьня капіталу, супроць фашызму і імпэрыялізму і пагражаючай небясьпекі вайны, калі не выкрываць і не змагацца на кожным кроку са шкоднаю роляю рэфармістаў з іх варожай рабочай клясе палітыкай.

Калі-б НРП зноў папрабавала адкрываць ролю «бесстароннага» пасярэдніка паміж II-м і III-м інтэрнацыяналамі, дык гэта ня было-б садзейнасьцю Камінтэрну, а садзейнасьцю другому інтэрнацыяналу. Хоць НРП цяпер не стаіць на пункце погляду Камінтэрну, яна, аднак, можа ўстанавіць сапраўднае рэвалюцыйнае супрацоўніцтва з камуністычнай партыяй Англіі і з Камінтэрнам. Камінтэрн гатоў да такога супрацоўніцтва, зразумела, пры ўмове захаваньня права на таварыскую крытыку ў выпадку неабходнасьці. Калі НРП сапраўды будзе энэргічна садзейнічаць барацьбе Камінтэрну, гэта будзе мець вялікае міжнароднае значэньне».

* * *

ЛЁНДАН, 26. (БЕЛТА). «ДЭЙЛІ УОРКЕР» паведамляе, што ліст сакратарыяту ВККІ ўчора абмяркоўвуўся ў выканкоме НРП, пры чым пастаноўлена перадаць яго міжнароднай падкамісіі выканкому для выпрацоўкі тэксту адказу.

У перадавой «Дэйлі Уоркер» указвае, што прапановы ВККІ павінны быць прадметам найшырэйшай дыскусіі ўнутры НРП. Адначасова, паводле слоў «Дэйлі Уоркер», кампартыя павінна прыняць усе меры, каб давесьці да ведама шырокіх мас зьмест прапаноў Камінтэрну і растлумачыць масам іх значэньне.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Тчэве

ВАРШАВА, 27. Як паведамляе сацыял-фашысцкі «РОБОТНІК», 23 чэрвеня ў ТЧЭВЕ перад будынкам магістрату больш 300 беспрацоўных нападзілі дэманстрацыю, патрэбуючы працы. Беспрацоўныя выпучылі ад сябе прадстаўнікоў, якія павінны былі перадаць старшыні гарадской управы патрабаваньні беспрацоўных. Калі-ж праз некалькі хвілін прадстаўнікі вярнуліся і абвясьцілі, што ні старшыні, ні яго намесьніка няма, дэманстрацыя накіравалася на пляц да будынку староства (кіраўніка павету). Аднак, староста не хацеў выслухаць патрабаваньняў беспрацоўных і заявіў прадстаўніком, што ў выпадку, калі беспрацоўныя не ачысьцяць пляц праз 15 мінут, ён выкліча паліцыю і калі будзе патрэбна—войска.

Дэманстранты, абураныя гэтай заявай старосты, пачалі асаджаць будынак староства, выкідваючы лёзунгі: «Мы патрабуем хлеба і працы!», «Мы ня хочам паміраць галоднай сьмерцю».

Выкліканы старостай атрад паліцыі, узброены гумовымі папкамі і вінтоўкамі з напожанымі штыкамі, разагнаў дэманстрантаў і зрабіў шматлікія арышты.

(Уласн. інфарм.).

Ануляваньне мандатаў с-д дэпутатаў ляндтагу

БЭРЛІН, 28 (ТАСС). Герынг растлумачыў, што дэкрэт аб забароне сацыял-дэмакратычнай партыі адносіцца таксама ад дэпутатаў ляндтагу, выбраных пры дапамозе сацыял-дэмакратаў. Бюро ляндтагу выключыла трох дэпутатаў дзяржаўнай партыі, выбраных у рэзультаце прадвыбарнай згоды з сацыял-дэмакратамі. Будуць выключаны таксама 4 сацыял-дэмакратычных дэпутаты ляндтагу, выпаўшыя з сацыял-дэмакратычнай фракцыі.

ФЫН ЮЙ-СЯН АРГАНІЗОВУАЕ АНТЫНАНКІНОВІ БЛЁК

ШАНХАЙ, 28 (Белта). Паводле вестак друку камандуючы войскамі Манчжоу-Го ў правінцыі Чахар генэрал Лю Вэй-дан нібыта выдаў цыркуляр, у якім указвае аб сваім звароце ў рады кітайскай армії і гатоўнасьці сумесна з Фын Юй-сянам змагаецца супроць Японіі, каб вярнуць страчаныя тэрыторыі. Гэта заява зьяўляецца рэзультатам доўгіх перагавораў паміж Фын Юй-сянам і Лю Вэй-данам. Адначасова з заявою Лю Вэй-дана 26 генэралаў прыхільнікаў Фын Юй-сяна таксама заявілі аб сваёй гатоўнасьці прадпрымаць супраціўленьне японцам. Такім чынам, становішча ў Чахары значна мяняецца, і магчымасьці згоды Фын Юй-сяна з Нанкінам аддаляюцца. Правіцыя Чахар знаходзіцца зараз пад поўным кантролем Фын Юй-сяна.

Замежная хроніка

* Германскі міністар народнай гаспадаркі Гугенбэрг падаў учора прэзыдэнту Гіндэнбургу заяву аб адстаўцы.

* Кіраўніцтва германскай нацыянальнай партыі выпесла пастанову аб самароспуску партыі.

* Таварыш міністра замежных спраў ПАЗШ Молей прыбыў у Англію. Молей заявіў, што ён будзе ажыццяўляць сувязь паміж амэрыканскай дэлегацыяй на лёнданскай канфэрэнцыі і прэзыдэнтам Рузвэльтам.



НА ЗДЫМКУ: 2.000-я калёна беспрацоўных у Дырборне (ПАЗШ) накіроўваецца да прадпрыемстваў Форда. На плякатах надпісы: «Усе на вуліцу. Галодны паход беспрацоўных на Фордзе».

З лёнданскай эканамічнай канфэрэнцыі

ГЕРМАНІЯ АДМАУЛЯЕЦЦА АД ЛІКВІДАЦЫІ МЫТНЫХ БАР'ЕРАЎ

ЛЁНДАН, 27. (БЕЛТА). Лёнданская прэса з кожным днём аддае ўсё менш і менш ўвагі сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі. Калі-б не штодзённыя справаздачы аб вялікасных прыёмах, балях, абедах і сьнеданьнях у гонар паасобных дэлегацый і ўсіх дэлегацый разам, дык скромныя заметкі аб работах канфэрэнцыі згубіліся-б сярод шырачайшых справаздач аб спартыўных спаборніцтвах і падрабязных пералікаў чарговых масавых арыштаў у Германіі.

На ўчарашнім пасяджэньні падкамісіі па галадзёвай палітыцы германскі дэлегат Поссэ заявіў, што Германія вітае абмеркаваньне пытаньня аб палягчэньні ў міжнародным маштабе гандлю сельска-гаспадарчымі прадуктамі. Але ў той-жа час ён падкрэсьліў патрэбнасьць, што Германія ня можа адмовіцца ад сваіх забарончых мытных збораў на гэтыя прадукты, бо яна абавязана абараняць інтарэсы «аграрных вытворцаў» як «самай стабільнай клясы насельніцтва Германіі». Далей Поссэ заявіў, што, на яго думку, абмежаваньні ў звароце замежнай валюты зьяўляюцца адною з самых сур'ёзных перашкод для замежнага гандлю. Аднак, ён ня думае, каб Германія, вымушаная абараняць стабільнасьць сваёй валюты, магла згадзіцца на скасаваньне абмежаваньняў у гэтай галіне.

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Пратэст паўпрэда СССР у Японіі тав. Юрэнева

ТОКІО, 27. (БЕЛТА). Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Японіі тав. Юрэнеў наведаў сёньня намесьніка міністра замежных спраў Сігеміцу, якому заявіў пратэст супроць дзеяньняў міноносца «Таціказе». Тав. Юрэнеў заявіў, што ён упаўнаважан сказаць ад імя савецкага ўраду, што ён (урад) не праміне выказаць жаль і прыняць меры пакараньня винаватых, калі весткі, паведамленыя японскім урадам, пацьвердзяцца, але што ён павінен настойліва патрабаваць прызнаньня недапушчальнасьці дзеяньняў «Таціказе» і дачы на будучы час морскім уладам строгіх інструкцый.

Расьсьледваньне намчацкага інцыдэнту

ХАБАРАЎСК, 28. (БЕЛТА). Камандыраваныя распараджэньнем савецкіх улад для расьсьледваньня камчацкага інцыдэнту прадстаўнікі НКЗС і пагранічнай аховы прыбылі 23 чэрвеня ў КРОНОКІ. Устанаўленью радыё-сувязі іх групы з Петрапаўпаўскам перашкаджае работа радыёстанцыі японскіх суднаў, якія ў гэтым раёне заглушаюць наша радыё. Данясэньне аб падзеях, асноване на расьсьледваньні, зробленым савецкімі прадстаўнікамі, паслана з нарочным у Петрапаўлаўск. Сакратар японскага консульства НОГУЧЫ, які павінен быў прыбыць на месца здарэньня на судне «Кіпсі-мару» з Усьць-Камчацку, да гэтага часу ня прыбыў у Кронокі, ня гледзячы на прадастаўленыя яму магчымасьці.

* *

ХАБАРАЎСК, 28. (БЕЛТА). Згодна атрыманых ад савецкіх прадстаўнікоў з КРОНОКІ адрывачных радыё-вестак, пацьвярджаецца, што ў раёне здарэньня, які ўказваецца японскімі ўладамі, каля мысу Ольгі паста пагранічнай аховы ня было. Бліжэйшы кантрольны пагранічны пост знаходзіцца за 60 клм. ад мысу Ольгі на мысе Кронокі. Абслугоўваўшая яго група пагранічнай аховы, ня гледзячы на пошукі, яшчэ ня знойдзена, і пёс яе ня высьветлен.

Затрыманьне савецкіх рыбакоў каля мысу Ольгі

ХАБАРАЎСК, 28. (БЕЛТА). Савецкія рыбакі рыбалоўнага катэру «АКО» былі затрыманы каля мысу ОЛЬГІ японскімі рыбапоўнымі суднамі «ГУСПО», якія разьмясьціліся ў гэтым раёне і вядуць узмоцненую рыбную лоўлю пад аховаю японскага міноносца. Савецкаму катэру прапановаў было накіравацца да міноносца, дзе рыбакі былі дапытаны і апушчаны пасьля складаньня пратаколу.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Усебеларускі зьезд дактароў

Даклад Нар. Кам. Аховы здароўя т. Шпэктарава

27 чэрвеня ў Менску ў клюбе мэталістаў адкрыўся Усебеларускі зьезд вучасткових і санітарных дактароў і работнікаў органаў аховы здароўя. Зьехалася каля 250 дэлегатаў.

З дакладу дня пытаньні аб гігіэнічным этапе сацыялістычнага будаўніцтва і задачах аховы здароўя, аб здраўпунктах, аб пляне другой пяцігодкі і аб санітарна-эпідэмічным становішчы і чарговых задачах.

Апрача таго, будуць працаваць секцыі па трахоме, сухотах, венэрычнай і здраўпунктах.

Зьезд адкрыў народны камісар аховы здароўя БССР тав. Шпэктараў. Па яго прапанове дэлегаты ўшанавалі ўстаўаньнем памяць памёршага барацьбіта за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю — Клары Цэткін.

У прэзыдыум выбраны т. т. Гінапо, Шаранговіч, Галадзед, Рыскін, Жабровуч, Іваноў, Чарвякоў, Лычоў, Кавальчук, Герцовіч, Закоўскі, Шпэктараў, Селівэстраў, Нісэнбаум, Караедаў, акадамік Гаўсман, прафэсары Мелкіх, Бурак, Хазанаў, Камінскі і інш.

Пад шумныя воплескі ўсяго зьезду ў ганаровы прэзыдыум выбраны таварышы: Сталін, Молатаў, Кагановіч, Калінін, Варашылаў, Кіраў, Арджанікідзэ, Мікаян, Кавіёр, Рудзутак, Швэрнік, Постышаў, Тэльман, Гікало, Галадзед, Убарэвіч.

Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) тав. Сталіну, тав. Молатаву, Варашылаву, Гікало і Галадзеду.

Зьезд вітаў делегацыі рабочых гарбарні «Бальшавік» і васьмі-санітарных работнікаў Менскага гарнізону.

Рабочыя «Бальшавіка» прад'явілі работнікам аховы здароўя сацыялістычны рахунак.

На гэтым-жа пасяджэньні тав. Шпэктараў выступіў з вялікім дакладам на тэму: «Сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва і задачы аховы здароўя».

Тав. Шпэктараў прывёў рад вельмі цікавых лічбаў, якія сьведчаць аб павышэньні матар'яльна-культурнага ўзроўню рабочых і калгасных мас.

У 1913 годзе на тэрыторыі Беларусі было 525 дактароў, пасьля акупацыі — 301, з якіх 75 у сельскіх мясцовасьцях. Да канца-ж першай пяцігодкі лік дактароў дасягнуў ужо 1.750 — у тры з паловай разы больш, чым у 1913 годзе і на 50 проц. больш, чым у 1928 годзе.

У гэтых адносінах БССР па сваёй арганізацыі аховы здароўя апярэдзіла такія краіны, як Польшча, Баўгарыя, Фінляндыя. Так, у Беларусі адзін дактар прыпадае на 3.428 чалавек насельніцтва, у Польшчы — на 4.100, Баўгарыі — 4.700, Фінляндыі — на 4.000.

Выраслa хлупная сетка ўстаноў аховы здароўя. У БССР — 9.000 больнічных ложкаў, 220 здраўпунктаў на прадпрыемствах, каля 3.000 яслёвых, у якіх знаходзіцца звыш 70.000 дзяцей.

Асабліваю цікавасьць прадстаўляюць прыведзеныя тав. Шпэктаравым лічбы аб зьмяншэньні сьмяротнасьці ў БССР. Так, дзіцячая сьмяротнасьць у параўнаньні з 1913 годам зьменшылася з 20 да 11 проц., агульная сьмяротнасьць — з 19 чал. на 1.000 да 12 чалавек. Сьмяротнасьць ад сухотаў зьнізілася ў гарадох і гарадзкіх паселішчах з 31,7 проц. да 15,7 проц.

Гэта ў той час, калі ў краінах капіталу ў выніку крызісу, беспрацоўя і зьбядненьня мас расьце сьмяротнасьць, асабліва сярод працоўнага насельніцтва. Так, сьмяротнасьць у Польшчы ў 1931 годзе склала 20,2 проц. на 1.000 чал., замест 16,8 проц. у 1930 годзе. У Нямеччыне адпаведна 13,6 проц. і 12 проц.

Дакладчык прывёў рад прыкладаў вылазак клясавага ворага і завастрыў увагу на неабходнасьці ўзьнімаць клясавай пільнасьці.

Тав. Шпэктараў падкрэсьліў неабходнасьць падпарадкаваньня ўсёй работы па ахове здароўя задачам сацыялістычнага будаўніцтва, каранная палішэньня якасьці абслугоўваньня працоўных мас, калчатковага выкараненьня элементаў сямейнасьці, групоўшчыны ў радох мед. работнікаў і г. д.

Парк культуры і адпачынку адпачываючых абслугоўвае дрэнна. Усяго ў парку адзін парок, за тым, каб купіць квасу ці вады трэба стаяць у чарзе.

НАЗНАЧЭНЬНІ

Прэзыдыум ЦВК БССР назначыў тав. Коніка З. Ю. намесьнікам народнага камісара рабоча-сялянскай інспэкцыі БССР; тав. Абрамава С. Н.—намесьнікам старшыні Вярхоўнага суда БССР і старшынёю крымінальнай калегіі Вярхоўнага суда; тав. Заліпэтэра А. К. другім намесьнікам старшыні АДПУ БССР.

Адкрываецца цырк Шаліто

Цэнтральнае кіраўніцтва дзяржцыркаў «Гамец» заключыла дагавор з Менскім гарсаветам на пабудову ў гарадзкім садзе супроць Эльводу летняга часовага будынку для цырку Шаліто на 2.500 месц.

Цырк будзе адкрыт 20 ліпеня і прабудзе ў Менску 2 з паловай—3 месяцы.

Для работы ў ім запрашаюцца лепшыя цыркавыя артысты і ў прыватнасьці 6 Эвальдо, сёстры Кох, прыбываюць лепшыя дзяржаўныя стайні дрэсіраваных коняй пад кіраўніцтвам Гуго Труцы, група дрэсіраваных ільвоў пад кіраўніцтвам Б. Эдэра, дрэсіраваныя слані вядомага нямецкага дрэсіроўшчыка Мэдрано і інш.

Цырк пакажа гледачу лепшыя нумары цыркавога мастацтва савецкіх і замежных цыркаў.

Аб парадку плянаваньня і рэгуляваньня выдавецкай справы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

I. Ліквідаваць Камітэт па справах друку пры СНК БССР.

II. У сувязі з ліквідацыяй Камітэту па справах друку пры СНК БССР усклясьці на пералічаныя ніжэй ведамствы і органы наступныя функцыі:

1) На Дзяржплян плянаваньне:

а) вытворчай дзейнасьці выдавецтваў,

б) капітальнае будаўніцтва і фінансаваньне друку,

в) збыту твораў друку,

г) падрыхтоўкі рэдакцыйна-выдавецкіх і паліграфічных кадраў,

д) разьмеркаваньне паперы.

Дзяржплян дае заключэньні па гадавых і квартальных плянах разьмеркаваньня паперы.

2) На ўпаўнаважанага Народнага Камісарыяту лясной прамысловасьці пры СНК БССР:

а) складаньне плянаў і апэрацыйнае плянаваньне патрэбы ў паперы як з боку друку, так і іншых спажыўцоў,

б) разьмеркаваньне ўсіх гатункаў паперы:

в) кантроль за расходваньнем усімі выдавецтвамі паперовых фондаў.

3) На Галоўліт:

а) дазвол на адкрыцьцё выдавецтваў і зацьверджаньне іх статутаў і

б) дазвол выпуску кніг, часопісяў і газэт і зацьверджаньне іх тыражоў, пэрыядычнасьці і аб'ёму.

4) На Ўпаўнаважанага Камітэту тварных фондаў:

а) вызначэньне адпускных цэн на творы друку і

б) рэгуляваньне гандлю творамі друку.

III. Усебеларускі агульна-выдавецкі кантрольны пост пры Камітэце па справах друку прымацаваць да Галоўліту.

IV. Архіў Камітэту па справах друку здаць Дзяржпляну БССР.

V. Скасаваць арт. арт. 1 і 5 пастановы СНК БССР за 16 лютага 1931 г. «Пра рэарганізацыю плянаваньня і рэгуляваньня друку» (З. З. БССР 1931 г., № 8, паст. 69).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Савету Народных Камісараў БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

27 чэрвеня 1933 г.
№ 929.

Новы склад вышэйшай зямельнай камісіі

Прэзыдыум ЦВК БССР зацьверджаў наступны склад Вышэйшай зямельнай камісіі: т. т. Бэнэк — старшыня камісіі, Стрэле — нам. старшыні, Сьмірноў, Грэбенчык, Дубоўсій, Пушчын, Шабуневіч (калгасьнік Менскага раёну).

Прапанавана таварышам Дзяржпляна, Цухавіцкага і Заслаўскага раённых комаў на працягу дэкады прадставіць у прэзыдыум ЦВК на адзей кандыдатуры з ліку правераных калгасьнікаў для ўвядзеньня іх у склад Вышэйшай зямельнай камісіі.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

30 чэрвеня г. г. а 5-й гадз. вечары ў Доме Камасьмолы (клюб Карла Маркса) культпроп ГК КП(б)Б склікае нарадзку культпрапаганды па пытаньнях летняй партыйнай вучобы і выніках агляду-конкурсу сеткі партыйнай асьветы.

На нараду павінны зьявіцца ўсе культпропы партакалектываў і ячэек з матэрыялямі становішча партасьветы і выніка мі конкурсу па сваім калектыве.

Культпроп ГК КП(б)Б.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. **ЗОНГ** КАХА�ньНЕ БЕДНАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ ў 2-х сэрыях. 10 частак

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ — Новы мастацкі фільм **ГОРАД у СТЭПУ** па раману А. С. Серафімовіча

ПРАЛЕТАРЫ — Новы замежны фільм з прыгодніцк. жыцьця **КЛЯЙМО „Б"**

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. — Лепшы гукавы мастацкі фільм **ПЕРАМОЖЦЫ НОЧЫ**

СПАРТАК Каса—з 3,30 м. — ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ **ЧАС—ГРОШЫ** камэдыя ў 6 частках.

ГОМЕЛЬСКАЯ ШКОЛА КААПВУЧУ з 1-га ліпеня 1933 г. пераводзіцца у ВІЦЕБСКІ ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ.

Усе арганізацыі і асобы, якія маюць прэтэнзіі, павінны заявіць у 5-дзённы тэрмін, пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Заг. школы Лісковіч.

Беларускі тэхнікум па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі ў сельскай гаспадарцы і па вывучэньні хэмічнай справы

абвяшчае **АСЕНЬНІ НАБОР** студэнтаў на I і II курсы.

Заявы падаюцца на імя дырэктара тэхнікуму з абавязковым прадстаўленьнем дакумантаў у арыгіналах, згодна даведніку НКА.

Прыём заяў з 1 ліпеня па 15 верасьня.

Прыёмныя іспыты з 20 па 25 верасьня.

Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка.

Тэрмін навучаньня ў тэхнікуме тры гады.

Асобы, залічаныя ў тэхнікум забясьпечваюцца: інтэрнатам, стыпэндыяй і сталоўкай.

Заявы накіроўваць па адрасу: Віцебск, пляц Волі, дом № 2—тэхнікум «АБШ».

На другі курс прымаюцца асобы скончыўшыя 8 ці 9 груп з адпаведнымі іспытамі.

Дырэкцыя тэхнікуму.

18-VI-г.г. **пайшла** з дому глухаямая 16 год, у чырвонай хустцы, чорнай катаначцы, шэрай спадніцы. Просьба паведаміць: пошта Уязляны, Цухавіцкага раёну, Азярычанскага сельсавету, вёска Шалягі, шэлегу Івану Мікалаевічу.

МЕНСКІ АЎТАДАРОЖНЫ ТЭХНІКУМ ГАЛОЎДАРТРАНСУ БССР

абвяшчае асеньні набор на першы курс дарожна-будаўнічай спэцыяльнасьці—120 асоб, з якіх 30 асоб на ляўрэйскае аддзяленьне.

Усе паступаючыя трымаюць іспыты за курс 7-мігодкі па грамадазнаўству, матэматыцы, фізыцы, хэміі і мове.

Узрост паступаючых у тэхнікум ад 16 да 30 год.

Прыём заяў да 15 жніўня г. г.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй, згодна пастановы СНК СССР, а іншагародніх і інтэрнатам.

Да заяў неабходна дадаўчыць дакументы (у арыгіналах): анкету аб сацпаходжаньні і сацстановішчы паступаючага і яго бацькоў, узросьце, асьвеце, здароўі, дзьве засьведчаныя фота-карткі, марак на 40 кап. Пры запатрабаваньні анкеты—марак на 20 кап.

Тэхнікум дае годнасьць тэхніка па пабудове і эксплёатацыі аўта-гужавых дарог.

Аб прыёмных іспытах будзе абвешчана дадаткова праз друк і асабіста па адрасу паступаючага.

Пачатак заняткаў з 1-IX г. г.

Дакументы накіроўваць па адрасу: Менск, Савецкая, 18.

Дырэкцыя.

ГОМЕЛЬСКІ ТЭХНІКУМ КАНЯГАДОЎЛІ

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ на першы курс у колькасьці 100 асоб.

У тэхнікум прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку ва ўзросьце ня менш 17 год. Да заявы патрэбна прыкласьці наступныя дакументы: аб сац. становішчы, аб адукацыі, аб нараджэньні, аб стаце здароўя і засьведчаную анкету.

Заявы падаваць да 10-VIII—33 г. па адрасу: Гомель, Канясаўгас 59, дырэктару тэхнікуму.

Іспыты будуць праводзіцца з 15-VIII па 20-VIII—33 г. па наступных прадметах: роднай мове, матэматыцы, хэміі, фізыцы і грамадазнаўстве. Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў-маняводаў сярэдняй кваліфікацыі для канясаўгасаў, калгасаў, дзяржконьзаводаў і інш. каняводчасіх устаноў.

Матар'яльныя умовы: стыпэндыя ад 40—50 руб. (па пасьпяховасьці), інтэрнат і сталоўка.

Дырэкцыя.

29-VI—1933 г. выходзіць з друку часопіс **„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"** № 7

з наступным зьместам

Гікало—Выступленьне на нарадзе сакратароў райкомаў КСМ і паліт-аддзелаў МТС па камсамольскай рабоце.

Анціпаў—Аб чыстцы партыі.

Дзмітрыеў—За бальшавіцкае правядзеньне прапалачнай, уборачнай і падрыхтоўку да збожжазагатоўчай кампаніі.

Пыжыкаў і Жунаў—Палітаддзелы — цытадэлі сацыялізму ў вёсцы.

Хэйфэц — Спаборніцтва дзьвюх сьветаў.

У аддзеле партбудаўніцтва зьмешчаны наступныя артыкулы:

М. З. і Л. Ф.—Вынікі партнарады па торфу.

Ф. Д.—З вопыту работы паасобных МТС у весьнавой сяўбе.

Злоткін—Аб парткіраўніцтве камсамолам.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ **„СОЮЗОРГУЧЕТА"** в 1-га чэрвеня г.г. арганізуе групу

СТАРШЫХ БУХГАЛЬТАРОЎ ДЛЯ СЫСТЭМЫ **БЕЛПЛОДГАРОДНІНА**

На курсы прымаюцца бухгальтары памбухі са стажам работы па двайной бухгальтэрыі ня менш 2-х год.

Стыпэндыя курсантам устаноўлівецца ад 100 да 150 р. у месяц, апрача гэтага 25 р. квартэрных.

Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.

Пасьля сканчэньня курсанты павінны прапрацаваць на раёне ў вышэйпаказанай сыстэме ня менш 2-х год.

Курсанты прымаюцца да сталоўні.

Заявы з далучэньнем дакумантаў аб сацстановішчы, сацпаходжаньні, аб рабоце бухгальтарам ці памбухам ня менш 2-х год, аб узросьце, аб адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын), аб працоўным стажы і даведку адміністрацыі ці прафсаюзнага калгасу аб вызваленьні з апошняга месца працы, ці вучобы, накіраваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, 3-я школа Навучальнага Камбінату „Союзоргучет".

Пры непрадстаўленьні ўсіх пералічаных дакумэнтаў заявы разглядацца ня будуць.

Тэрмін падачы заяў да 1 ліпеня г.г.

Аб дні пачатку вучобы будзе паведамлена кожнаму залічанаму паведамленьнем на дом.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТА".

Патрэбен блёк да трактара Ф. П., паведаміць: п.-а, Юрэвічы, Мазырскага раёну, Бярозаўскага сельсавету, калгасу „Чырвоны араты".

ЗАВОЧНІКІ ВЫРАЖ І ЗАХАВАЙ.

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАНЬНЯ ПАРТАКТЫВУ ПРЫ ЦК КП(б)Б

РАСКЛАД РАДЫЁ-ПЕРАДАЧ НА ЛІПЕНЬ м-ц 1933 г.

Усе перадачы Інстытуту адбываюцца праз Менскую радыёстанцыю РВ-10 на хвалі 1105 мэтраў ад 18 гадз. 30 мін. да 19 гадз. 30 мін.

I. Завочны камвуз.

ПАЛІТЭКАНОМІЯ (1-шы курс).
5-VII—„Капітал і дадатковая вартасьць". 1-я лекцыя.
26-VII—„Палітычныя партыі і аграрнае пытаньне ў рэвалюцыі 1905 г.".
ГІСТОРЫЯ РАСП і СССР (1-шы і 2-гі курс).
13-VII—„Дзяржаўны пераварот 3-га чэрвеня 1907 году".
ГІСТОРЫЯ УсеКП(б) (2-гі курс).
14-VII—„Ленінскае вучэньне аб перарастаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную".
29-VII—„Бальшавізм на міжнародным арэне" (Шляхі перамогі).
ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ (прадметнікі).
23-VII—„Аб філёзофскай спадчыне У. І. Леніна".

II. Завочная саўпартшкола.

ГІСТОРЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ (1-шы курс).
3-VII—„Якобінская дыктатура".
19-VII—„Рэвалюцыя 1848 г. у Францыі і Германіі".
ГІСТОРЫЯ УсеКП(б) (2-гі курс).
11-VII—„Бальшавіцкая партыя ў рэвалюцыі 1905—1907 г. г.".
25-VII—„Партыя ў годы рэакцыі і ўздыму".
ЛЕНІНІЗМ (2-гі курс).
8-VII—„Клясы і клясавая барацьба ў эпоху дыктатуры пралетарыяту".

„ЦК партыі абавязвае палітыкіраўніцтвы Наркамзему СССР і НКсаўгасаў і палітаддзелы МТС і саўгасаў максымальна выкарыстаць стварэмую сетку радыёвузлоў, радыёстанцый, і радыёаўдыторыі, рашуча дабіваючыся ператварэньня іх у магутны сродак партыі ў справе палітычнага і культурнага выхаваньня калгасьнікаў, рабочых МТС і саўгасаў і палажэньня апэрацыйнага кіраўніцтва партыі на вёсцы".
(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 7-IV—1933 г.).

III. Завочныя курсы партыйна-камсамольскага актыву калгасаў, саўгасаў і МТС.

Завочнікі курсаў партактыву слухаюць лекцыі: а) па цыклю сацыялістычнай сельскай гаспадаркі; б) па пытаньнях праграм УсеКП(б) і Камінтэрну і статуту партыі.

IV. Цыкль лекцый па пытаньнях праграм УсеКП(б) і Камінтэрну і статуту партыі.

Цыкль разьлічан на шырокі партыйны, камсамольскі і беспартыйны актыў гораду і вёскі, а таксама на завочнікаў усіх форм вучобы.

Перадаецца ў чэрвені:
1. Што такое партыя і чаму яна патрэбна рабочай клясе?
2. Як будуецца партыя бальшавікоў і якія ўмовы яе баяздольнасьці? (2 лекцыі).

Перадаюцца ў ліпені:
3. Сусьветная сыстэма капіталізму, яе разьвіцьцё і наміючая пагібель—8-га ліпеня.
4. Праграма Саюзу Камуністаў, праграма УсеКП(б), праграма Камінтэрну—13 ліпеня.
5. Ленінскае вучэньне аб дыктатуры пралетарыяту—21-га ліпеня.
6. Стратэгія і тактыка партыі—28-га ліпеня.

Будуць перададзены ў жніўні:
7. Міжнароднае значэньне бальшавізму.
8. Асновы эканамічнай палітыкі пралетарскай дыктатуры.
9. Аграрная праграма УсеКП(б).
10. Праграма УсеКП(б) у галіне нацыянально-каляніяльных адносін.
11. Тав. СТАЛІН, як правадыр, тэарэтык і арганізатар УсеКП(б)—прадаўжальнік справы Леніна.

V. Радыёлекцыі па пытаньнях сацыялістычнай сельскай гаспадарцы

4-VII—„Свячасова ўбраць і апрацаваць лён, канопелі, бульбу і гародніну—наша задача".
6-VII—„Барацьба са стратамі зернавых культурна ўборачную кампанію".
7-VII—„Пытаньні сілазаваньня кармоў".
15-VII—„Задачы арганізацыі працы і падрыхтоўкі цягавай сілы і інвэнтару на зборкі, азімай сяўбы і заблівага вораньня".
22-VII—„Забясьпечэньне свячасовую зжатчу хлеба дзяржаве".
27-VII—„Пытаньні агратэхнікі азімых пасеваў".

VI. Радыёлекцыі па пытаньнях бягучай палітыкі партыі.

Перадаюцца 1-га, 17-га і 31-га чысла.

Тэмы лекцый абвяшчаюцца па радыё і ў газэце „Зьвязда".

VII. Адказы на лісты завочнікаў і радыёслухачоў.

Перадаюцца 20-га ліпеня.

VIII. Інструкцыйная перадача для работнікаў сыстэмы завочнай партвучобы—10-га ліпеня.

6, 12, 18, 24, і 30 ліпеня перадачы партвучобы ня будзе.

1-га 10-га і 20-га ліпеня з 19 гадз. 25 м. (ў канцы перадачы) паведамляцца аб зьменах у гэтым раскладзе і тэматыка лекцый па пытаньнях бягучай палітыкі.

ЗАВОЧНІК!

Наведвай усе радыё-перадачы па сваёй форме вучобы,—радыёлекцыі дапамагаюць самастойнай рабоце над кнігай.

Ідучы на радыёлекцыю, абавязкова вазьмі з сабой запісную кніжку і алоўкі, рабі канспэкты па тэме лекцыі і ўсё неабходнае для запісу.

Арганізоўвай слуханьне цыкляваных і эпізадычных лекцый шырокімі масамі рабочых, калгасьнікаў і беднякоў-бераднякоў аднасобнікаў.

Свае заўвагі адносна радыёперадачы і радыёслуханьня, а таксама пажаданьні на далейшы час паведамляйце ў ІМАО пры ЦК КП(б)Б—Менск, Карла Маркса, 47-30.

Дырэкцыя інстытуту.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ САДОВА-ГАРОДНІ ІНСТЫТУТ

АБВЯШЧАЕ

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

на аддзяленьні:
1) садоўніцтва,
2) гароднінства,
3) інжынэрна-тэхналёгічнае

у ліку 125 асоб.

Заявы падаюцца на імя дырэктара інстытуту з абавязковым прадстаўленьнем дакумэнтаў (